ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 34 (4989) 31 жніўня 2018 г. ISSN 0024-4686

16+

Мясціны і асобы Янаўскага краю стар. 4—5

Нацыянальная літаратурная: агляд прэтэндэнтаў стар. 10—11

Кнігі на выбар ад вядучых выдавецтваў стар. 12—13

Наш шлях

Дзень беларускага пісьменства: чакае Іванава



Фота БелТА.

СПЕЦЫЯЛЬНЫ ВЫПУСК

З пакалення ў пакаленне як галоўны запавет у нас перадаецца: трэба набываць веды. Адукацыя для нашых продкаў — як для тых, хто жыў у гарадах, так і для тых, хто апрацоўваў зямлю, — лічылася тым нябачным, але важкім скарбам, які стане найлепшай падтрымкай у жыцці.

Са стагоддзя ў стагоддзе захоўвалася імкненне распаўсюджваць веды і несці асвету: праз рукапісныя кнігі, створаныя манахамі-рупліўцамі, друкаваныя выданні Скарыны і буквары, што мелі прыйсці ў кожную хату. Сучасныя фаліянты і электронныя кнігі сведчаць аб працягу пісьмовай культуры — на новым узроўні і з новымі магчымасцямі, якія стварыла цывілізацыя.

З году ў год на пачатку верасня Беларусь пацвярджае свой шлях, што пралягае праз веды, адукацыю, развіццё інтэлекту. Шлях, напоўнены сэнсам. Яго адкрываюць словы...

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 18034

Аляксандр Карлюкевіч: «Каб не згубіць будучыню»

Дзень беларускага пісьменства для Міністэрства інфармацыі, як справаздача за год: што зроблена на ніве мастацтва слова, якія кнігі можна лічыць здабыткамі айчыннага кнігавыдання? З якімі клопатамі ісці галіне ў заўтра? На гэтыя і іншыя пытанні «ЛіМа» адказвае міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ.

Фота Кастуся Дробава.

— Дзень беларускага пісьменства як свята ўсталёўваўся дзеля таго, каб, з аднаго боку, засведчыць старажытнасць пісьмовай культуры Беларусі, а з другога — падтрымаць (заахвоціць) імкненне да ведаў сучасных грамадзян. Іванава — горад, які гістарычна замацаваны на культурнай карце Беларусі асаблівымі постацямі. Ці падтрымліваецца гэтая плынь у горадзе ў наш час?

— Пра гэта лепш запытацца ў саміх жыхароў старажытнага Іванава, ці Янава, як яго раней называлі, саміх берасцейцаў… З тых паездак, сустрэч з гэтай старонкай, якія адбыліся ў мяне сёлета, мяркую, што людзі ў горадзе жывуць цікавыя, тыя, якія імкнуцца да здабыткаў і здзяйсненняў у розных галінах, у розных кірунках. Мо таму і кніга, якую падрыхтаваў да свята рэдактар раённай газеты «Янаўскі край» Ігар Гетман, — «Людзі Янаўскага краю» чытаецца з цікавасцю. У цэнтры аповеду — людзі, нашы сучаснікі, тыя, хто здабывае працоўную славу, тыя, хто выйшаў з гэтай старонкі. А Іванаўшчына — радзіма і гісторыка Пятра Брыгадзіна, і міністра спорту і турызму Сяргея Кавальчука, і знакамітага на ўсю Беларусь аграрніка Аляксея Скакуна…

— На свята звычайна прыязджаюць з падарункамі. А лепшы падарунак, як вядома, кніга. Што падрыхтавана за год для тых, хто сочыць за святам? Ці ёсць важкія набыткі і дасягненні ў кніжнай культуры Беларусі ад мінулага Дня пісьменства?

— Такімі набыткамі мне бачацца выданні, якія прадстаўлялі Беларусь на конкурсе СНД «Мастацтва кнігі». Уражлівы год: шмат нашых кніг атрымалі вельмі высокія ўзнагароды. І ў гэтым — работа цэлага пакалення беларускіх кніжнікаў, прытрымліванне традыцый. У нас у краіне за дзесяцігоддзі склалася высокая культура кніжніцтва. Назаву некаторыя з такіх выданняў: зборнік вершаў народнага песняра Беларусі Янкі Купалы «“А хто там ідзе?” на мовах свету», кніга Валянціны Паліканінай «Ни к чему быть одному», мастацкі альбом Рыгора Сітніцы «Простыя рэчы», зборнік гісторыка-краязнаўчых апавяданняў Міколы Маляўкі «Спадчына, або Каб не стаць манкуртам», анталогія кітайскай паэзіі ў перакладах Міколы Мятліцкага «Пялёсткі лотаса і хрызантэмы». Раю ўсім цікаўным да беларускай кнігі разгарнуць альбом «Беларускі касцюм» выдавецтва «Беларусь», пагартаць кнігу «Беларускі след у культуры і архітэктуры Масквы» выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі».

— Колькі найменняў кніг атрымлівае краіна штогод (ці за мінулы год)? Колькі з іх на беларускай мове (ці расце колькасць беларускамоўнай прадукцыі і яе запатрабаванасць)? І якая вага сучаснага мастацкага пісьменства, беларускай літаратуры?

— Лепш весці гаворку пра ўжо здзейсненае, пра лічбы мінулага года. Летась, у 2017 годзе, выпушчана 9590 кніг і брашур. Агульны тыраж — 23,1 мільёна экзэмпляраў. Сярэдні наклад на аднаго жыхара краіны — 2,4 тысячы экзэмпляраў. Літаратура на беларускай мове заняла 13,7 працэнта ў агульных абсягах кнігавыдання. Гэта калі меркаваць па назвах. Па тыражах — 18,8 працэнта. Для прыкладу: у 2016 годзе па назвах беларускамоўных выданняў у працэнтных суадносінах з кнігай на рускай мове было выпушчана 11,7 працэнта, а па тыражы — 16,2 працэнта. Так што лічыце, ёсць рост ці няма. Іншая справа — хацелася б развіцця і па аб'ёмах літаратуры на беларускай мове, і па яе якасным змесце.

Цікавай, між іншым, падаецца і наступная статыстыка. На беларускую мову перакладаюцца і выдаюцца творы з рускай мовы, а таксама з англійскай, шведскай, нямецкай, іспанскай, кітайскай, латышскай, фінскай, румынскай, албанскай, балгарскай, венгерскай, грэчаскай, лацінскай, нарвежскай, украінскай і іншых моў народаў свету.

— Штогод на беларускае свята пісьменства прыязджаюць замежныя госці. Колькі гасцей і адкуль мы чакаем сёлета? Чаму для нас важны ўдзел замежных гасцей? Ці ўзнікаюць адмысловыя кніжныя праекты ў выніку іх удзелу ў Дні беларускага пісьменства? Ці ёсць штосьці падобнае ў іншых краінах?

— Калі гаварыць пра круглы стол беларускіх і замежных пісьменнікаў, які штогод праходзіць у пярэдадзень Дня беларускага пісьменства з агульнай ідэяй — «Мастацкая літаратура як шлях адно да аднаго», то гэты творчы праект мае даўнюю традыцыю. І праводзіцца ўжо больш як дзесяць гадоў — з 2007 года. Штогод у нашу краіну на пачатку верасня прыязджаюць паэты, празаікі, перакладчыкі, літаратурныя крытыкі з больш як 10—12 краін. Сёлета таксама будуць госці з Расійскай Федэрацыі, Польшчы, Украіны, Кітая, Эквадора, Азербайджана, Казахстана, Кыргызстана, Літвы, Латвіі, Узбекістана… Заснавальнікі круглага стала — Міністэрства інфармацыі, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкі дом «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літаратура». Шмат намаганняў для арганізацыі работы замежных пісьменнікаў і ў фармаце Дня беларускага пісьменства, і ўвогуле ў плане зносін з літаратарамі розных краін прыкладаюць непасрэдна літаратурна-мастацкія перыядычныя выданні краіны — у першую чаргу часопіс «Нёман» на чале з Аляксеем Чаротам, а таксама і «Маладосць», і «Полымя», і, канечне ж, «ЛіМ», і грамадска-палітычная газета «Звязда» разам са сваім дадаткам «Союз Евразия». Усім можна толькі падзякаваць.

На мой погляд, сустрэчы з літаратарамі іншых краін спрыяюць не проста развіццю зносін з іншымі нацыянальнымі літаратурамі, але і дапамагаюць зверыць гадзіннікі, дапамагаюць зазірнуць у іншыя мастацкія прасторы. Дыскусіі, якія пачынаюцца на круглых сталах, спрыяюць развіццю доўгатэрміновых зносін. Ведаю, што ўдзельнікі сустрэч пакідаюць Беларусь і пасля кантактуюць паміж сабою, ініцыіруюць розныя пераклады, звязваюць свае краіны. Фактычна Беларусь літаратурная — пляцоўка для сяброўства, наладжвання адносін паміж рознымі краінамі.

Зразумела, мы не адны такія ў свеце. І ў іншых краінах збіраюцца літаратары. Часам нават з нашай падказкі і ініцыіраваны тыя ці іншыя форумы пісьменнікаў. Сёлета прайшла адмысловая міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная ўзбекскай літаратуры, у Ташкенце. Беларусь на ёй прадстаўляў Ганад Чарказян. Некалькі гадоў назад пачаў праводзіцца пісьменніцкі форум — літаратараў краін Наўруза — у Душанбэ.

Што да праектаў, то важную ролю ў кансалідацыі літаратурных сіл на постсавецкай прасторы адыгрывае інтэрнэт-партал «Сугучча: літаратура і публіцыстыка краін Садружнасці», якім апякуецца Выдавецкі дом «Звязда». Мадэратары ў насычэнні гэтага праекта — з розных краін: з Казахстана — Святлана Ананьева, Рыма Арцем'ева, Любоў Шашкова; з Азербайджана — Камран Назірлі, Салатын Мірзоева, Яшар Аліеў; з Расійскай Федэрацыі — Зульфія Хананава, Роберт Мінулін, Валерый Тургай, Юрый Шчарбакоў, Адам Ахматукаеў, Лула Куна, Марат Гаджыеў; з Малдовы — Юрый Іваноў; з Украіны — Глеб Кудрашоў; з Кыргызстана — Алег Бандарэнка…

Выходзіць літаратурна-мастацкі альманах «Сугучча» на рускай мове. У ім істотную частку займаюць пераклады прозы і паэзіі беларускіх аўтараў на рускую мову. У планах аднаго з айчынных выдавецтваў — выданне перакладнога альманаха на беларускай мове. Здаецца, атрад перакладчыкаў працуе ў нас даволі актыўна. Сярод моладзі ў гэтых шэрагах — і Таццяна Сівец, Юлія Алейчанка, Алесь Емяльянаў-Шыловіч, Дар'я Нечыпарук, Валерыя Радунь, Яна Явіч… Толькі ў Выдавецкім доме «Звязда» і «Мастацкай літаратуры» за апошнія гады выйшлі на рускай і беларускай мовах кнігі пісьменнікаў з іншых краін — Яўгенія Еўтушэнкі, Валянціна Распуціна, Валерыя Казакова, Алеся Кажадуба, Аляксандра Чэрняка, Любові Турбіной, Уладзіміра Шуглі, Барыса Косціна, Касыма Нурбадава, Роберта Мінуліна, Эдварда Мілітаняна, Чынгіза Алі аглу, Севіндж Нурукызы… Выходзіць прадстаўнічая серыя перакладаў кітайскай паэзіі — «Светлыя знакі. Паэты Кітая». Пабачылі свет ужо 12 кніг. І гэта толькі з 2014 года. Выйшлі дзве аўтарскія анталогіі кітайскай паэзіі, падрыхтаваныя Міколам Мятліцкім. У кожнай чытача чакае сустрэча са 100 (!) аўтарамі.

— Дзеля таго, каб падкрэсліць важнасць пісьменніцкай працы, у Беларусі была заснавана Нацыянальная літаратурная прэмія. Ці паўплывала заснаванне прэміі на большую актыўнасць сярод пісьменнікаў? Ці было больш працы ў адборачнай камісіі намінантаў сёлета ў параўнанні з мінулым годам у сувязі з матэрыяльным павелічэннем прэміі?

— Вынікі спаборніцтва амаль 60 намінантаў у сямі намінацыях Нацыянальнай літаратурнай прэміі будуць агучаны ў Дзень беларускага пісьменства 2 верасня. Мне здаецца, што ўдзельнікаў магло б быць значна больш. Мо пашырэнню колькасці намінантаў на будучыню будзе спрыяць і веданне вагі, калі так можна сказаць, прэміі, яе матэрыяльны складнік. У некалькі разоў вырас грашовы памер прэміі, якая будзе ўручацца ў 2018 годзе. Канечне, хацелася б, каб на адзначаныя кнігі, адзначаных творцаў звярнула ўвагу шырокае кола чытачоў. Ці так яно будзе — залежыць ад многіх складнікаў. Сам факт прысуджэння прэміі — гэта ніякая не абаронная грамата. Ні перад чытачом, ні перад крытыкай.

Ды і прэмій павінна быць шмат. У дадатак да прэстыжнай Нацыянальнай літаратурнай, спадзяюся, будуць і прэміі літаратурна-мастацкіх выданняў. Ёсць яшчэ і прэмія конкурсу маладых аўтараў «Першацвет». Па выніках конкурсу выдаецца аднайменны альманах. Газета «Звязда» шмат гадоў праводзіць конкурс на лепшае апавяданне.

— Наколькі актыўны наш чытач? Ці ёсць у яго асаблівыя запыты і патрабаванні да кніг? Наколькі сучасныя бацькі гатовы і хочуць выхоўваць сваіх дзяцей чытачамі (згодна з лічбамі распаўсюджвання дзіцячай кнігі)?

— Здаецца, пытанне, якое патрабуе бязмежнага адказу. І адказваць на яго, дыскутаваць вакол тэм, ім абазначаных, лепш у тым выпадку, калі маеш досвед у рабоце са школьнікамі, дзецьмі… Сапраўды, лічбы паказваюць: дзіцячую кнігу набываюць і, відаць, чытаюць больш, чым мастацкую кнігу ўвогуле. «Белкніга» нядаўна падсумавала, што набываюць часцей у сістэме айчыннага дзяржаўнага кнігагандлю. Высветлілася — кнігу «Дзіцячы атлас Беларусі», толькі што выдадзеную «Мастацкай літаратурай». Другая пазіцыя ў рэйтынгу продажаў па краіне. У тым самым рэйтынгу не на апошнім месцы і легендарная аповесць «Міколка-паравоз» Міхася Лынькова.

Што да бацькоўскіх памкненняў, то, напэўна, усё ж і нашай школе варта задумацца пра многія ініцыятывы ў дачыненні да чытання. А яшчэ лепш працаваць над гэтым усім разам — і кнігавыдаўцам, і пісьменнікам, і школе, і настаўніцтву, і бібліятэкарам, і арганізатарам культурнага жыцця ў краіне… Будзем нешта дзяліць, не праявім кансалідацыю — згубім чытача, а следам згубім будучыню.

Да Першага верасня — з першым «Букваром»!

Фота Кастуся Дробава.

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прэзентавалі факсімільнае выданне першага «Буквара» 1618 года. Арыгінальная кніга з'явілася роўна 400 гадоў назад у друкарні Віленскага Святадухаўскага братэрства ў Еўі. «Буквар» — гэта кніга, якая ніколі не застанецца незапатрабаванай; яе хоць раз у жыцці трымаў у руках кожны чытач. Але дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі нагадаў, што лёс падручнікаў незайздросны: такія кнігі амаль не захоўваюцца для нашчадкаў. Зараз ва ўсім свеце існуюць толькі два арыгінальныя асобнікі першага «Буквара»: адзін знаходзіцца ў Бібліятэцы Мідл Тэмпл (Лондан), другі — у Каралеўскай бібліятэцы Даніі. Камандзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі падрыхтаваць такі важны і складаны міжнародны праект дапамаглі Пасольства Рэспублікі Беларусь у Вялікабрытаніі, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і Бібліятэка Мідл Тэмпл у Лондане.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

Вітаем, новая сталіца!..



Фота Кастуся Дробава.

Хачу выказаць самыя шчырыя віншаванні са святам, якое яднае ўсіх беларусаў, прываблівае шматлікіх гасцей з розных краін свету.

Дзень беларускага пісьменства праз гады і гарады пусціў парасткі вялікай духоўнасці беларусаў. Мы з захапленнем углядаемся ў тыя куткі нашай Радзімы, дзе ўжо адбыліся святочныя ўрачыстасці. Кожная са сталіц свята пацвердзіла багатае гістарычнае мінулае, адметнасць і непераўзыдзеную прыгажосць беларускага краю.

Сёння Іванава здзіўляе сваёй старажытнасцю і маладосцю. Тут гучыць прыгожае мастацкае слова, ушаноўваюцца лепшыя пісьменнікі краіны, надаецца вялікая ўвага кнізе — усё гэта сведчыць пра Беларусь як высокаадукаваную краіну, якая вартая павагі ў свеце.

Няхай добры настрой, які дораць іванаўскія сустрэчы, памножыцца творчымі здабыткамі і новымі знаёмствамі з аматарамі беларускай кнігі.

Мікалай ЧАРГІНЕЦ,
старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

КРАЯЗНАЎЦЫ РЫХТУЮЦЦА ДА АГЛЯДУ

Падчас падрыхтоўкі да Дня беларускага пісьменства аддзяленням СПБ было прапанава ўключыць у склад дэлегацый пісьменнікаў, якія найбольш актыўна працуюць па тэме «Краязнаўства». «Калі больш дакладна, у тэме "Радзімазнаўства", — заўважае першы намеснік старшыні СПБ Алена Стэльмах. — Адно з пытанняў на апошнім прэзідыуме СПБ якраз было прысвечана аналізу літаратуры гэтага напрамку. І вось у Іванаве адбудзецца своеасаблівы агляд творчых сіл, скіраваных да адвечных жыццёвых каштоўнасцей. Гэта сапраўды вельмі ёмісты пласт літаратуры, які ў Год малой радзімы набывае асабліва важкае гучанне».

Мабыць, няма таго пісьменніка, які б не звяртаўся да асабістага досведу ўспрымання рэчаснасці: не ўспамінаў пра свой род, Бацькаўшчыну, не асэнсоўваў вытокі жыццёвага сталення. За апошнюю чвэрць стагоддзя айчынная літаратура значна папоўнілася творамі, дзе ўсё глыбей спазнаецца і ўсведамляецца багатае гістарычнае мінулае беларусаў, значнасць нашай культуры, мовы, самабытных традыцый. Можна з упэўненасцю гаварыць пра тое, што гады незалежнай Беларусі (больш адкрытыя архівы, інтэрнэт-крыніцы) паспрыялі росту нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, і ў аснове гэтага працэсу, несумненна, літаратурныя здабыткі як класікаў, так і сучасных літаратараў.

— Няўмольны час многае мяняе: знікаюць вёскі, іншыя паселішчы, а з імі адыходзяць у нябыт і адметнасці навакольных мясцін, — працягвае Алена Стэльмах. — Але, дзякуючы руплівым краязнаўцам, не страчваецца повязь вякоў. Кнігі, як скарбонкі памяці, захоўваюць для нашчадкаў дух слынных прашчураў.

У павільёне Саюза пісьменнікаў Беларусі 2 верасня будзе наладжана выстаўка найбольш адметных твораў нашых сучаснікаў — Алеся Карлюкевіча, Анатоля Статкевіча-Чабаганава, Міхася Пазнякова, Ігара Пракаповіча, Антона Параскевіна, Івана Ярашэвіча. Кнігі гэтых і многіх іншых аўтараў распавядаюць пра вёскі і паходжанні розных назваў, пра славутых людзей, пра камяні, якія таксама ўмеюць гаварыць…

Пляцоўка Саюза пісьменнікаў Беларусі ў Іванаве пачне працаваць 1 верасня ў 12.00. «Ад родных ніў з любоўю шчырай» — так у Брэсцкім абласным аддзяленні СПБ назвалі творчую праграму, дзе будзе прадстаўлена выстаўка карцін берасцейскіх пісьменнікаў-мастакоў Мікалая Бусько і Анатоля Галушкі. Тут жа будзе працаваць кніжная выстаўка «Брэстчына літаратурная». Узнагароды атрымаюць пераможцы абласнога літаратурнага конкурсу «Духоўная веліч». Пісьменнікі правядуць прэзентацыі сваіх кніжных навінак, выступяць самадзейныя артысты з Брэста, Лунінца, Іванава.

2 верасня а палове адзінаццатай на пляцоўцы СПБ збяруцца прадстаўнікі ўсіх дэлегацый, дзе да ўдзельнікаў свята з прывітальным словам звернецца кіраўніцтва саюза пісьменнікаў, найбольш актыўныя ўдзельнікі Дня беларускага пісьменства атрымаюць узнагароды.

Радаваць прыгожым словам гасцей свята берасцейцы пачнуць з самага рання. А вось далей творчую эстафету падхопяць аддзяленні. З 12.00 да 13.45 Магілёўскае абласное прапануе праграму «Тут пашчасціла мне нарадзіцца». З 13.45 да 14.30 Мінскае абласное прадставіць творчы праект «Міншчына — сэрца Радзімы маёй». З 14.30 да 15.15 Мінскае гарадское аддзяленне пакажа святочную імпрэзу «Тут усё бацькоўскае, святое». Палескі экслюзіў «Палессе. Зямля святая. Зямля Кірылы…» з 15.15 да 16.00 прадставіць Гомельскае абласное аддзяленне. А Гродзенскае абласное аддзяленне далучыцца з праграмай «Родны край — маё натхненне» з 16.00 да 17.00.

Нагодай для такой назвы літаратурна-мастацкай дзеі, якую прадставіць Саюз пісьменнікаў Беларусі на галоўнай пляцоўцы свята а 14 гадзіне стала выданне кнігі пад аднайменнай назвай. Гэта фотаальбом са здымкамі Уладзіслава Цыдзіка і вершамі 65-ці сучасных беларускіх паэтаў, творы якіх прысвечаны Радзіме. Праект ажыццёўлены пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Згодна са сцэнарыем, на сцэну выйдуць аўтары, чые ўзнёслыя радкі ўпрыгожваюць выданне, — Міхась Пазнякоў, Навум Гальпяровіч, Марыя Кобец, Святлана Быкава, Ірына Карнавухава, Бажэна Ганушкіна, Віктар Кажура, Юлія Алейчанка, Маргарыта Латышкевіч. Прагучаць і песні ў выкананні Эдуарда Ханка, Алега Елісеенкава, Кастуся Цыбульскага, Сяргея Краўца, Таццяны Атрошанка і ўраджэнца іванаўскай зямлі Леаніда Нікольскага.

Іванаўскай бібліятэцы ад Саюза пісьменнікаў Беларусі будуць перададзены кніжныя навінкі, якія далучаць чытачоў да цікавага і захапляльнага свету літаратуры.

Марыя ЛІПЕНЬ

Акцэнты тыдня:

краіна

Віншаванні. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народную артыстку Беларусі Кацярыну Фадзееву з днём нараджэння. «Ваша індывідуальнасць, выканальніцкае майстэрства і высокі прафесіяналізм прынеслі вам шырокую вядомасць і любоў шматлікіх паклоннікаў харэаграфічнага мастацтва. За гады актыўнай і плённай творчай дзейнасці вы стварылі цэлую галерэю яркіх артыстычных вобразаў і арыгінальных пастановак, якія захапляюць гледачоў і назаўсёды застаюцца ў іх сэрцах. Асобных слоў удзячнасці заслугоўвае ваша педагагічная дзейнасць, работа па выхаванні адоранай моладзі», — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены, што талент і невычэрпная энергія Кацярыны Фадзеевай і ў далейшым будуць садзейнічаць развіццю айчыннай балетнай школы, росквіту айчыннай культуры.

Імідж. Беларусь адкрывае ганаровае консульства ў Лазане, паведамляе Пасольства Беларусі ў Швейцарыі. Лазана — сталіца франкамоўнага швейцарскага кантона Во — мае званне Алімпійскай сталіцы свету. Урад Швейцарыі выдаў экзекватуру Андрэю Нажэскіну — ганароваму консулу Беларусі ў Лазане з консульскай акругай у кантонах Во, Вале, Жэнева, Неўшатэль, Фрыбур, Юра, інфармуе БелТА. Урачыстае адкрыццё чакаецца ў найбліжэйшы час.

Конкурс. Стартаваў рэспубліканскі творчы конкурс «Пад знакам Года малой радзімы!», паведамляе Міністэрства інфармацыі, якое з'яўляецца арганізатарам мерапрыемства. Асноўныя мэты конкурсу — рэалізацыя задач дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі ў развіцці рэгіёнаў краіны; фарміраванне пашаны да малой радзімы, уклад у яе развіццё, паказ яркіх дасягненняў па захаванні і адраджэнні роднага краю; садзейнічанне выхаванню ў моладзі патрыятызму і любові да Радзімы праз паняцце «малая радзіма», а таксама фарміраванню актыўнай жыццёвай пазіцыі. На конкурс прадстаўляюцца матэрыялы, апублікаваныя ў друку або выпушчаныя ў эфір тэлевізійных або радыёвяшчальных СМІ, размешчаныя на інтэрнэт-сайтах на працягу 2018 года. Матэрыялы накіроўваюцца ў Міністэрства інфармацыі не пазней за 15 студзеня. Узнагароджанне пераможцаў будзе арганізавана ў лютым будучага года.

Рэгіёны. У Мядзелі да абласных «Дажынак» плануюць адкрыць гасцініцу і ЗАГС, паведаміў журналістам старшыня Мядзельскага раённага Савета дэпутатаў Алег Бароўка падчас асабістага прыёму грамадзян памочнікам прэзідэнта — інспектарам па Мінскай вобласці Ігарам Яўсеевым. Абласное свята пройдзе ў другой палове верасня. Не забыліся ў Мядзелі і пра сімвал горада. Мясцовы ўмелец стварыў арыгінальны арт-аб'ект — скульптуру вугра. Малая архітэктурная форма ўжо прывабіла ўвагу гасцей і мясцовых жыхароў.

Гісторыя. Дзяржаўнае прадпрыемства «Мінская спадчына» запрашае новых інвестараў да забудовы Ракаўскага прадмесця. Аўкцыён на права заключэння дагавора фінансавання будаўніцтва паводле генеральнага плана адбудзецца 24 верасня. Пасля гэтага спецыялісты пачнуць распрацоўку праектнай дакументацыі, а з кастрычніка 2019 года — будаўніча-мантажныя работы. Квартал забудовы ўяўляе сабой сучасны шматфункцыянальны турыстычны комплекс з прэзентацыяй нацыянальнага каларыту. Размяшчэнне ў гістарычным цэнтры сталіцы ў межах вуліц Ракаўская—Няміга—Раманаўская Слабада вызначыла прыярытэт: двух- і трохпавярховыя домікі ў гістарычным стылі.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

ЛіМ КАЛЯНДАР

31 жніўня 65 гадоў спаўняецца Аляксею Сазанчуку, пісьменніку.

31 жніўня 70 гадоў адзначае Юрый Піндзіч (Ватуцін), пісьменнік.

31 жніўня — 70 гадоў з дня нараджэння Васіля Шырко, празаіка, публіцыста, паэта.

1 верасня 50 гадоў святкуе Таццяна Дашкевіч, пісьменніца.

1 верасня 65 гадоў спаўняецца Ганне Радновай (Кашубе), пісьменніцы.

3 верасня 65 гадоў святкуе Уладзімір Руль, пісьменнік.

4 верасня 85 гадоў спаўняецца Вячаславу Варламаву, пісьменніку.

5 верасня 60 гадоў адзначае Аляксандр Алейнік, пісьменнік.

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

1 верасня *— на свята дзіцячай кнігі з удзелам Міхася Пазнякова ў гарадскую бібліятэку № 5 (11.30).*

1 верасня *— на імпрэзу, прысвечаную Году малой радзімы, у гарадскую бібліятэку № 17 (13.15).*

1 верасня *— на імпрэзу, прысвечаную Году малой радзімы, з удзелам Аляксандра Плавінскага і Наталлі Алейнікавай у Цэнтральную гарадскую бібліятэку імя Янкі Купалы (15.00).*

2 верасня *— на паэтычна-песенную імпрэзу сталічнага аддзялення СПБ «Тут усё бацькоўскае, святое», прысвечаную Году малой радзімы, у межах Дня беларускага пісьменства ў Іванаве (14.30).*

3 верасня *— на сустрэчу з Уладзімірам Мазго ў гімназію № 29 (9.00).*

3 верасня *— на імпрэзу «Мне пашчасціла тут нарадзіцца» прысвечаную Году малой радзімы, з удзелам Іны Фраловай у гімназію № 4 (8.30).*

3 верасня *— на сустрэчу з Міколам Маляўкам у каледж паліграфістаў (9.00).*

3 верасня *— на сустрэчу з Таісай Трафімавай у СШ № 165 (9.00).*

3 верасня *— на імпрэзу «Жыцця і высокага слова выток», прысвечаную Году малой радзімы, у СШ № 218 (9.30).*

3 верасня *— на сустрэчу з Вольгай Шпакевіч у СШ № 139 (10.00).*

3 верасня *— на сустрэчу з Нінай Галіноўскай у Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа (10.00).*

3 верасня *— на сустрэчу з Янай Явіч у Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа (13.00).*

4 верасня *— на імпрэзу «Нібы матуля родная галубіш», прысвечаную юбілею Анатоля Грачанікава, у СШ № 18 (14.00).*

4 верасня *— на сустрэчу з Уладзімірам Мазго, прысвечаную Году малой радзімы, у дзіцячую бібліятэку № 6 (12.00).*

6 верасня *— на прэзентацыю кнігі Тамары Бунта «Чароўны кошык» у Літаратурны музей Янкі Купалы (16.00).*

Віцебскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

3 верасня *— на творчы вечар Тамары Красновай-Гусачэнкі «Край мой любы, край адвечны» ў Полацкую цэнтральную бібліятэку імя Ф. Скарыны (9.00).*

3 верасня *— на ўрачыстае закрыццё II Міжнароднага літаратурнага фестывалю «Цэнтр Еўропы — 2018» з удзелам Тамары Красновай-Гусачэнкі і Галіны Загурскай у Полацкі раённы цэнтр культуры (18.00).*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

1 верасня *— на Дзень ведаў з удзелам старшыні літаратурнага аб'яднання «Ветэран» Леаніда Іскрова і членаў аб'яднання ў гімназію № 1 Магілёва (9.00).*

Ураджэнец Янаўскага краю Напалеон Орда быў сапраўдным патрыётам сваёй Радзімы, пра што сведчыць яго жыццёвы шлях. Ён уславіў Радзіму ў сваіх малюнках: захаваў вобраз колішняга жыцця і шмат якіх мясцін, дзякуючы чаму мы можам зразумець, як выглядала беларуская зямля ў XIX стагоддзі. Сёння мы прапануем праз гэтыя малюнкі (паводле зборніка Леаніда Несцярчука «Напалеон Орда. Шлях да Бацькаўшчыны») зладзіць гістарычнае падарожжа па адметных куточках Брэстчыны.

«Іванава. Парафіяльны касцёл», 1891 г. Выгляд фасада касцёла са шчытком і надпісам. З левага боку драўляная званіца. На першым плане — чатырохбаковая капліча Святога Андрэя Баболі. Малюнак створаны алоўкам, падпраўлены гуашшу.

Фрагмент экспазіцыі Мотальскага музея народнай творчасці. (Развіццё ткацтва. Старажытная вышыўка.)

Вандроўка па Янаўскім краі:

Дзень беларускага пісьменства раскрывае з новага боку нашы гарады і мястэчкі. Здаецца, колькі разоў чулі пра той жа Полацк, Рагачоў, Шчучын, Глыбокае ды іншыя. Аднак напярэдадні свята мы маем магчымасць зірнуць на гэтыя мясціны па-іншаму, паглыбіцца ў мясцовую культуру і гісторыю. Тым больш, самабытны Янаўскі край да сённяшняга дня захоўвае адметныя традыцыі і звычаі.

У ГОСЦІ ДА ЛАБОРАЎ

Іванаўскі рэгіён славуты вядомымі імёнамі. Напрыклад, Змітро Віталін — выхадзец з вёскі Сухое, якая знаходзіцца побач з Іванавам, Марыя Андайковіч-Бутаўт, якая нарадзілася ў вёсцы Баландзічы Іванаўскага раёна, Францішак Бруздовіч, які жыў у Бродніцы. Нельга не ўзгадаць Фёдара Дастаеўскага. Вядома, можна казаць, што ён тут ніколі не быў і нічога не напісаў. Але з Іванаўскай зямлі паходзіць род Дастаеўскіх. І сёння гэтыя мясціны наведваюць праўнукі і прыхільнікі творчасці сусветнага класіка. Але асабліва ганарацца ў раёне сваім земляком Напалеонам Ордам, які ўславіў не толькі родныя Варацэвічы, але і ўсю Беларусь далёка за межамі.

Ёсць у раёна сучасныя рупліўцы: тут на слыху імя Марыі Гарупы, якая пакінула вялікую спадчыну, узняўшы вялікі пласт інфармацыі аб вёсках Іванаўскага раёна. Усе дэталі выкладзены ў кнізе «Вёска, дзе буслы ўзнімаюць крылы». Рэгіён ганарыцца Анатолем Крэйдзічам, аўтарам цікавых кніг, Лізаветай Саханчук, якая піша цікавыя творы патрыятычнага і краязнаўчага характару. Годны павагі паэт Андрэй Мазько, зачароўвае паэтычнымі творамі Надзея Паліўка… У Іванаўскім раёне таксама існуе літаратурнае аб'яднанне «Ясельда», Клуб юнкараў: у яго ўваходзяць маладыя людзі, якія часта друкуюць свае паэтычныя і празаічныя творы на старонках раённай газеты.

— Усе прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі Іванаўскага раёна будуць задзейнічаны ў мерапрыемствах Дня беларускага пісьменства, — расказвае начальнік аддзела культуры Іванаўскага райвыканкама Валянціна Барадзінчык. — У першы дзень свята мы рэалізуем праект «Янаўскія замалёўкі», які ўяўляе сабой паэтычныя чытанні на балконах. На цэнтральных пляцоўках пакажуць сябе не толькі паэты, пісьменнікі, але і мясцовыя кампазітары, якія прадставяць свае творы. Упэўнена, што іванаўскія творцы раскрыюць свой патэнцыял перад усёй краінай і пакажуць адметную культуру Іванаўшчыны, якую захоўвалі нашы продкі.

Сёлета, акрамя традыцыйных мерапрыемстваў, якія праходзяць у Дзень беларускага пісьменства, у Іванаве падрыхтаваны новыя цікавінкі: на свята духавой музыкі «Фанфары-2018» прыедзе 18 духавых калектываў вобласці. Таксама будзе арганізаваны фестываль разьбяроў-мастакоў. На працягу тыдня майстры ўжо ствараюць свае шэдэўры. Першага верасня госці змогуць убачыць вынікі іх працы. Пасля драўляныя скульптуры будуць размешчаны ў гарадскім парку: у Іванаве з'явіцца свая алея пісьменнікаў і паэтаў.

На адной з цэнтральных пляцовак горада наведвальнікаў чакае тэатралізавана-музычная дзея «Лаборская карчма», такім чынам арганізатары імкнуцца пазнаёміць з ладам жыцця мясцовых жыхароў — лабораў. Госці змогуць пачуць лаборскую мову, убачаць унікальныя экспанаты іх побыту. На шчасце, ёсць людзі, якія змаглі гэта захаваць. Дакладна, раён мае адметнасць, каб завабіць турыстаў.

ПРОДКІ І НОУ-ХАУ

Першае, з чаго прапануюць пачынаць экскурсію па Іванаўскім раёне мясцовыя жыхары, гэта з аграгарадка Моталь, які называюць «дзяржава ў сваёй дзяржаве». Менавіта тут знаходзіцца знакаміты на ўсю Беларусь Мотальскі музей народнай творчасці, які назвалі жамчужынай Палескага краю.

Будынак музея пабудаваны згодна з праектам сядзібы былога мясцовага пана Юргенсона. Наведвальнікі могуць пабываць у васьмі экспазіцыйных залах: гісторыі, земляробства, ільноапрацоўкі, рамёстваў, ткацтва, вопраткі, абрадаў, народных традыцый. Фонд музея неверагодна багаты: налічвае больш за 27 тысяч экспанатаў.

У свой час да Моталя мела дачыненне каралева Бона Сфорца, гэтыя землі падарыў ёй кароль польскі. Бона Сфорца ў 1555 годзе вярнула мясцовым жыхарам права на вольнасць, правяла тут зямельную рэформу. Таму цэнтральную плошчу паселішча лю-дзі назвалі ў гонар каралевы. На плошчы знаходзілася драўляная царква, якая потым згарэла. Але людзі пабудавалі новую мураваную царкву: яна захавалася і сёння знаходзіцца побач з Музеем народнай творчасці.

Фрагмент экспазіцыі Мотальскага музея народнай творчасці (Лодка «Чайка»).

У музеі прадстаўлены макет, па якім візуальна можна зразумець, як выглядаў Моталь у даваенны час. Да Другой сусветнай вайны тут пражывала шмат яўрэяў — трэцяя частка жыхароў раёна. Яны займаліся гандлем, жылі на цэнтральнай вуліцы, побач з якой была сінагога. Дарэчы, у Моталі нарадзіўся і жыў да 11-гадовага ўзросту першы прэзідэнт Ізраіля Хаім Вейцман. У гады вайны больш за 2000 мотальскага мірнага яўрэйскага насельніцтва было расстраляна… А цяпер нашчадкі былых жыхароў Моталя прыязджаюць з іншых краін, каб наведаць радзіму продкаў.

У музеі можна ўбачыць старажытны від транспарту, які дапамагаў мясцовым жыхарам пракарміць свае сем'і, — лодкі і сані, у якіх перавозілі прадукты земляробства і рыбу. Транспарт унікальны па свёй канструкцыі. Як кажуць супрацоўнікі музея, такіх экспанатаў глядач не ўбачыць нідзе. А ў адной з выставачных залаў рэканструяваны інтэр'ер сялянскай хаты. Тут можна ўбачыць печ, ложак, спецыяльныя драўляныя хадункі, якія былі апорай для хадзьбы маленькіх дзяцей, а ў цэнтры пакоя вісіць калыска для нованароджанага! Навуковы супрацоўнік музея Вольга Кульбеда падкрэслівае, што цяпер у Моталь вярнулася мода на такія калыскі. Людзі дастаюць іх з гарышчаў, купляюць адно ў аднаго. Калыска вельмі каштоўная тым, што яна абабіта даматканым палатном. Пад яго падкладаюць салому, і дзіця вельмі камфортна спіць.

У адной з залаў прадстаўлены віды рамёстваў, распаўсюджаных у Моталі: сталярная, бондарская справа, саломапляценне, ільнаводства. Асобная экспазіцыя прысвечана бондарству. Дарэчы, у Іванаве дзейнічае адзіная ў Беларусі школа бондарства, дзе сёння вучацца дзеці. Кажуць, што рамяство іх так захапляе, што малыя пачынаюць лепш вучыцца ў школе.

Наогул, багаты на майстроў край. Пра гэта сведчыць і эксклюзіўная калекцыя старажытных інструментаў мясцовага майстра Юрка Сцяпана, які будаваў незвычайныя драўляныя дамы. І можна пабачыць адмысловыя станкі, на якіх калісьці выраблялі посуд. Мясцовыя жыхары не маглі яго купляць у крамах з-за высокага кошту. Таму майстры сталі самі вырабляць бочкі для саленняў, маслабойкі, вёдры, нават жлукты — нешта накшталт пральнай машыны. Унутр прыстасавання кідалі вопратку, засыпалі попелам і залівалі вадой, пакідалі на некаторы час, а пасля паласкалі ў рацэ.

ГАСПАДЫНІ З ПАСАГАМ

Яшчэ са старажытных часоў мясцовыя жыхары выбіралі сабе пару толькі са сваёй вёскі. Калі ж жаніх хацеў ажаніцца з дзяўчынай з іншай вёскі, яму прыходзілася аддаваць пану вельмі вялікі выкуп за яе. І гэтая традыцыя — ажаніцца з аднавяскоўкай — існавала ў Моталі яшчэ да 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Перад вяселлем нявеста павінна была вышыць жаніху прыгожую вясельную кашулю, а ён — падарыць ёй боты са шнуроўкай, толькі тады дзяўчына давала згоду на шлюб. Касцюм у нявесты быў ружова-блакітны і лічыўся вельмі дарагім… Яго беражліва захоўвалі і скарыстоўвалі 5—6 пакаленняў нявест з роду.

Да гэтага часу ў аграгарадку пякуць спецыяльны мотальскі каравай, прычым абавязкова дзве сям'і — жаніха і нявесты. Гэты каравай з'яўляецца галоўным сімвалам на вяселлі. Яго абавязкова замешвае шчаслівая ў шлюбе жанчына альбо цяжарная. У канцы вяселля каравай абавязкова дзеляць паміж гасцямі. Дарэчы, традыцыя выпечкі мотальскага каравая ўваходзіць у спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.

У кожнай вёсцы Іванаўскага раёна быў свой непаўторны ўзор ткацтва. А якраз Мотальскае ткацтва лічылася эталонам на Беларусі: мясцовыя ручнікі ведалі не толькі ў краіне, але і за яе межамі. Іх асаблівасць была ў тым, што гаспадыні не капіравалі ўзоры адна ў адной, а абапіраліся на свой густ. У выніку атрымліваліся абсалютна непадобныя ўзоры. Канцы ручнікоў заўсёды пакідалі, потым плялі іх уручную. Самымі прыгожымі лічыліся мотальскія льняныя ручнікі. Нягледзячы на тое, што льняная вытворчасць у Моталі была выкаранена ў 1970-я гады, мясцовыя гаспадыні да сённяшняга дня захавалі гэтае рамяство, карыстаючыся льнянымі ніткамі, набытымі ў крамах. Дарэчы, вясельны абрад у Моталі заўсёды суправаджаецца даматканым мотальскім ручніком. А калі нараджаецца дзяўчынка ў сям'і, маці абавязкова збірае ёй пасаг, у які ўваходзіць дзесяць ручнікоў і некалькі абрусаў.

Мотальскі музей народнай творчасці вельмі папулярны: сюды прыязджаюць наведвальнікі з розных краін свету. Акрамя экскурсій, супрацоўнікі музея імкнуцца праводзіць інтэрактыўныя мерапрыемствы. Для дарослых супрацоўнікі сумяшчаюць экскурсіі з жывым гукам, народнай песняй, паказваюць, як адбываецца абрад вясельнага каравая, праводзяць майстар-класы па вырабе кветак для вясельных караваяў. Часам у музеі праходзяць дэгустацыі мясцовых традыцыйных страў.

Асабліва кранае, калі традыцыямі захапляюцца дзеці. Іх тут вучаць колішнім гульням: як лавіць каменьчыкі ці чыжыкаў круціць, а пасля яшчэ прапануюць бабуліны пачастункі — каб смак роднага застаўся на ўсё жыццё…

мясціны і асобы

Музей Напалеона Орды. Від з боку.

ШЛЯХАМІ НАПАЛЕОНА ОРДЫ

Адным з самых знакавых культурных аб'ектаў Іванаўшчыны з'яўляецца музейны комплекс Напалеона Орды ў вёсцы Варацэвічы, які складаецца з карціннай галерэі і музея імя мастака. Дарэчы, па словах кіраўніцтва комплексу, музей — гэта далёка не ўсё, чым могуць здзівіць у Варацэвічах. Тут плануецца пабудаваць турыстычны комплекс. Зараз актыўна вядзецца праца па ўзнаўленні радавога дома-маёнтка Ордаў ва ўрочышчы Чырвоны Двор. На месцы разбуранага дома зараз знаходзіцца яго копія. Дом зроблены з драўлянага бруса і пакрыты гонтам, у будучыні будуць узноўлены і сельскагаспадарчыя пабудовы.

Памяць пра таленавітага земляка вельмі беражліва захоўваюць на Іванаўшчыне. Практычна ўсе яго творы разышліся па вядомых музеях розных краін. Але не толькі з-за багатай мастацкай спадчыны гэтай асобы наведванне комплексу ў Варацэвічах будзе не менш пазнавальным.

Першая зала музея знаёміць гасцей з дзяцінствам мастака і кампазітара. Тут можна даведацца пра цікавыя рэчы, звязаныя з сям'ёй творцы. Напалеон Орда нарадзіўся ў сям'і Міхаіла Орды і Юзэфіны Бутрымовіч. Вядома, што мама мастака паходзіла з багатага роду і была адзінай дачкой у сям'і. Бацька Напалеона Орды быў інжынерам-фартыфікатарам: будаваў дарогі і аб'екты ваеннага прызначэння. Паколькі Міхаіл Орда быў вельмі захоплены біяграфіяй Напалеона Банапарта, то ён выбраў для свайго сына незвычайнае для Палесся імя. У сям'і Міхаіла Орды і Юзэфіны Бутрымовіч было пяцёра дзяцей. Бацька рана пайшоў з жыцця, і маці выхоўвала дзяцей сама. Юзэфіна Бутрымовіч была адукаваная жанчына, яна захаплялася музыкай, таму ўсе дзеці ў сям'і атрымалі якасную пачатковую адукацыю. У фондах музея ёсць дакументы, якія пацвярджаюць, што Напалеон Орда паспяхова скончыў Свіслацкую гімназію. І захаваліся дакументы, у якіх паказана, якім быў дом сям'і Ордаў, па тых часах — невялікі: 16 пакояў. Але маёнтак сям'і быў адметны не домам, а сельскагаспадарчымі пабудовамі, якіх налічвалася больш за 21. У маёнтку таксама былі сад, ліпавая алея, незвычайнай формы саджалкі, якія захаваліся да гэтага часу. А дом, на жаль, быў разбураны.

Афіцыйныя раскопкі ва ўрочышчы Чырвоны Двор адбыліся толькі ў 2004 годзе. Прадметаў было знойдзена мала, таму што з 1970 года мясцовыя жыхары прыходзілі туды шукаць каштоўнасці. Аднак аб'екты, якія ўдалося знайсці, сёння з'яўляюцца экспанатамі музея. Адзін з найкаштоўнейшых экспанатаў — куфар з дома Напалеона Орды. Яго ў музей перадалі мясцовыя жыхары. У той час у такіх куфрах захоўвалі вопратку і прадукты харчавання.

У музеі таксама знаходзяцца два важныя дакументы. Першы — запіс з царкоўнай кнігі пра тое, што 12 лютага ў сям'і Міхаіла Орды і Юзэфіны Бутрымовіч было ахрышчана немаўля, якому далі трайное імя — Мацвей-Тадэвуш-Напалеон. Дзякуючы гэтаму дакументу, можна з дакладнасцю казаць, што Напалеон Орда нарадзіўся ў вёсцы Варацэвічы. А другі дакумент — некралог на смерць Напалеона Орды, які быў выпушчаны ў Варшаве 5 мая 1883 года. У канцы некралога напісана, што пасля таго, як развіталіся з мастаком і кампазітарам, яго цела было перавезена і пахавана ў радавым склепе горада Янава. На жаль, месца пахавання не захавалася.

Цэнтральная зала музея прысвечана французскаму перыяду жыцця Напалеона Орды. У канцы 1830 — пачатку 1831 года на тэрыторыі сучаснай Беларусі ўспыхнула паўстанне, актыўным удзельнікам якога быў Напалеон Орда. Ён вызначыўся ў баях пад Коцкам, быў адзначаны вышэйшай вайсковай узнагародай таго часу — ордэнам *Virtuti Militari*. Паколькі паўстанне было задушана і ўсіх яго ўдзельнікаў чакала страшная доля, Напалеон Орда вырашыў эмігрыраваць. Як пісаў у сваіх дзённіках, імкнуўся з'ехаць хоць бы на час. Маці Напалеона Орды дала сыну блаславенне на эміграцыю. Ён пешшу, пад чужым прозвішчам адправіўся ў Парыж.

Што дала Францыя Напалеону Ордзе? Менавіта там ён сустрэўся з Фрэдэрыкам Шапэнам, які першапачаткова стаў яго настаўнікам, а затым лепшым сябрам. Там жа пазнаёміўся з самымі знакамітымі музыкантамі, мастакамі, пісьменнікамі таго часу. Дарэчы, у музеі прадстаўлены фотаздымак замалёўкі Напалеона Орды, на якім намаляваны Фрэдэрык Шапэн перад смерцю.

Менавіта ў Парыжы Напалеон Орда ажаніўся з маладой француженкай Ірынай Бугле. У іх нарадзіўся сын. Але цяга да дому заўсёды была вельмі моцнай. Пражыўшы 23 гады ў Францыі, ён вярнуўся ў родны маёнтак. Вярнуўся адзін, без сям'і. Пасля паўстання ён больш не меў права валодаць радавым маёнткам, а мог пражываць там толькі да таго моманту, пакуль была жывая яго маці. Пасля паўстання 1860-х гадоў у Напалеона Орды канчаткова адабралі права на пражыванне ў Варацэвічах.

У музеі часта задаваліся пытаннем, ці была ў Варацэвічах жонка Напалеона Орды. У 2009 годзе ў Карцінную галерэю прыехалі прамыя нашчадкі Напалеона Орды з Парыжа. Яны прывезлі тры папкі дакументаў сямейнага архіва, з якіх стала зразумела, што Ірына Бугле прыязджала ў Варацэвічы на наступны год пасля ад'езду Напалеона Орды з Парыжа — гэта быў 1857 год. У дакументах напісана, што маці мастака вельмі цёпла прымала нявестку з унукам.

На жаль, мастацкіх твораў Напалеона Орды ў музеі мы не ўбачым, толькі іх фатаграфіі. Аднак дакументальная база ў комплексе цікавая. Можна даведацца дадатковую інфармацыю аб паўстаннях і ўсёй сям'і Напалеона Орды.

КАРАНІ РОДУ ГЕНІЯ

Вёска Дастоева — яшчэ адзін гонар Іванаўшчыны. Менавіта адсюль ідуць карані знакамітага роду Дастаеўскіх. Дарэчы, пра гэта мала хто ведае сёння. У 1506 годзе баярыну Даніілу Рцішчаву была падорана грамата на ўладанне некалькімі вёскамі. Для будавання сядзібы ён выбраў Дастоева. Менавіта тут на свет з'явіліся два яго сыны. Першынцу Івану далі падвойнае прозвішча Рцішчаў-Дастаеўскі, а наступныя пакаленні сталі ўжо Дастаеўскімі. Сядзіба не захавалася. Зараз у межах функцыянавання Саюзнай дзяржавы праводзяцца перамовы аб яе ўзнаўленні. Але больш як 30 гадоў назад у мясцовай сярэдняй школе быў створаны літаратурна-краязнаўчы музей імя Фёдара Дастаеўскага, які налічвае больш за тры тысячы каштоўных экспанатаў.

Паходная кніга манаха Кіева-Пячэрскай лаўры канца XVII стагоддзя ў Народным літаратурна-краязнаўчым музеі імя Фёдара Дастаеўскага.

Калі пад'язджаеш да школы, у вочы адразу кідаецца прыгожы Свята-Троіцкі храм. А недалёка ад яго знаходзіцца не менш адметны помнік вялікаму класіку. Супрацоўнікі музея падкрэсліваюць, што музей не знаходзіцца на месцы сядзібы, яна месцілася за тры кіламетры адсюль. Таксама ў музеі адзначаюць, што самае галоўнае пытанне, якое задаюць наведвальнікі: ці быў калі-небудзь Фёдар Міхайлавіч у Дастоеве? Не быў. Дастаеўскія ў Дастоеве жылі да сярэдзіны XVII стагоддзя. Іх маёнтак разбурыла войска Багдана Хмяльніцкага. З-за фінансавых цяжкасцей сям'я не магла яго ўзнавіць, таму Дастаеўскім прыйшлося з'ехаць.

Цэнтральнае месца ў музеі займае раздзел «Дастоева і Дастаеўскі». Тут размешчаны фотакопіі дакументаў пра жыццё і творчасць класіка, яго творы розных гадоў выдання і надрукаваныя на розных мовах. У 2007 годзе Дастоева наведаў праўнук Дастаеўскага Дзмітрый Андрэевіч, які падарыў музею ўнікальнае генеалагічнае дрэва роду Дастаеўскіх. Гэта адзін з найкаштоўнейшых экспанатаў музея.

Музей, безумоўна, унікальны. Акрамя таго, што тут сапраўды вельмі многа інфармацыі пра род Дастаеўскіх, можна яшчэ ўбачыць цікавыя артэфакты. Напрыклад, карту 1865 года, на якой указана, як размяркоўваліся зямельныя надзелы, альбо шлюбны кантракт 1899 года, часопісы «Ніва» 1912 года, уніяцкія абразы канца XVIII стагоддзя. Прадстаўлена ў экспазіцыі і паходная кніга манаха Кіева-Пячэрскай лаўры канца XVII стагоддзя.

Сёння музей падтрымлівае цесныя сувязі з маскоўскім фондам Дастаеўскага, а таксама з музеямі Дастаеўскага ў Старай Русе і Санк-Пецярбургу. Дарэчы, музей карыстаецца вялікай папулярнасцю. Сюды прыязджаюць турысты з розных краін свету. Асабліва любяць Дастоева, па словах супрацоўнікаў музея, немцы і расіяне.

ХРАМ МАДОННЫ

Наведаўшы папярэднія мясціны, абавязкова трэба заехаць у вёску Махро, дзе размешчана карцінная галерэя імя беларускага мастака Аляксея Кузьміча.

У гэтай вёсцы Аляксей Кузьміч нарадзіўся. Яго аднавяскоўцы расказвалі, што дзень нараджэння мастака запомніўся тым, што была моцная навальніца, паўвёскі згарэла. А дом Кузьмічоў ацалеў. Маці мастака ўбачыла ў гэтым знак, прадвесце для сына. Так і адбылося: ён стаў асобай, здольнай бачыць неверагоднае ў простым. Мастак вучыўся ў Анатоля Рубановіча, усё жыццё ўспамінаў яго з цеплынёй. Менавіта майстэрню першага настаўніка ён называў сваёй акадэміяй.

Аляксей Кузьміч вырас у шматдзетнай сям'і (у яго было пяцёра сясцёр), ён вельмі добра разумеў жаночую псіхалогію. І гэта адлюстравалася ў яго творах. Многія мастацтвазнаўцы крытыкавалі творцу за тое, што ва ўсіх карцінах ён выяўляў толькі адзін твар — сваёй жонкі. Менавіта яе мастак лічыў ідэалам і музай. А яна сама казала: «Ён пісаў не мяне, а зборны вобраз». Тым не менш усе мадонны сапраўды падобныя. Імя Аляксея Кузьміча ўвайшло ў Кнігу рэкордаў Расіі і краін СНД як мастака, які напісаў самую вялікую колькасць твораў з вобразамі Мадон за ўсю гісторыю жывапісу!

У экспазіцыі музея захоўваецца мноства твораў мастака ў жанры ню. У вёсцы Мохра ёсць паданне: калі няплодная жанчына паглядзіць хоць адзін раз на гэтыя творы Аляксея Кузьміча, яна зможа зацяжарыць…

У галерэі аднавілі майстэрню майстра. Прывезлі яго мэблю, нават палатно, на якім можна ўбачыць апошнюю недапісаную работу. А на стале пад шклом — чарнавыя накіды. Асноўныя іх сюжэты мастак бачыў у снах, а з раніцы занатоўваў на паперы…

Незвычайныя людзі Іванаўшчыны. І, напэўна, ёсць тыя, хто яшчэ ў пачатку дарогі і пакуль шукае свой асаблівы талент.

Вікторыя АСКЕРА, фота аўтара

«Белін. Палац», 1864 г.
Від з боку парку. Палац двухпавярховы. Асаблівую прыгажосць яму надавала круглая вежа. Малюнак створаны алоўкам, падпраўлены сепіяй.

САМОТНЫ ПАЛЕСКІ ПТАХ

Яго жыццё было звязана пераважна з Берасцейшчынай: Бярозаўшчынай, Івацэвіччынай, Ляхавіцкім, Драгічынскім і Ганцавіцкім краем, з Піншчынай, але найбольш з Пружаншчынай… Ён амаль усё жыццё працаваў настаўнікам-філолагам, аб'ездзіў і абхадзіў палескія гарадкі, мястэчкі, вёскі, бальшакі і лясныя сцежкі-дарожкі. Мікола Сымонавіч Купрэеў — паэт і празаік, вядомы і любімы многімі.

Не сядзелася яму на месцы і ў апошнія гады: нягледзячы на хворыя ногі, спачатку з адным кійком, а потым і на мыліцах часта выпраўляўся ў дарогу. Не зважаючы на фізічную нямогласць, і ў сталым узросце ахвотна выбіраўся ў Брэст. З радасцю прымаў запрашэнні на літаратурныя імпрэзы, сустрэчы з чытачамі, са студэнтамі і выкладчыкамі роднага філалагічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна.

У лепшыя часы свайго жыцця прывабліваў сяброў, калег, сваіх вучняў начытанасцю, улюбёнасцю ў літаратуру, дзяўчат — мужчынскай прыгажосцю, рамантычнай узнёсласцю, светла-журлівай загадкавасцю ў паглядзе праніклівых блакітных вачэй. У апошнія гады часцей быў самотным, спакутаваным хваробамі і фізічным болем, але мудра-зычлівым, з пільнай цікавасцю ў вачах да жыцця, літаратуры, да творчасці калег, да ўсіх нас…

Памяць, боль і сум выкрасалі ў душы М. Купрэева натхненне, падтрымлівалі творчы намер — выказаць уласную задуменна-самотную мелодыю жыцця. Пра сябе ён гаварыў: «*Я — задуменна-самотны… Так сталася, што ўва мне заўжды "стаіць" задуменна-самотная мелодыя… Ды і як яе не помніць, калі яна са мной, ува мне заўжды — з усвядомленых дзён маленства па сёння… Бо на душы вельмі рана стала задуменна-самотна. І ціха*».

Задуменная самота, якой прасякнута большасць твораў М. Купрэева, — не толькі ўласны экзістэнцыйны боль, але і боль цэлага пакалення дзяцей вайны. У ім — вытокі іх вымушанага ўнутранага дэсідэнцтва, вытокі драматычнага светаадчування самога М. Купрэева да канца зямных дзён. У час вайны на вачах будучага пісьменніка, шасцігадовага хлапчаняці, фашысты і паліцаі забівалі яго маладую і прыгожую матулю і яшчэ жывую затоптвалі ў балотную твань. Жах забойства і пахавання мамы ўсё жыццё смылеў, абпальваў лёс М. Купрэева, з узростам перайшоў у экзістэнцыйны купрэеўскі боль і тую пранізлівую самоту, якія мноства разоў светапоглядна і эмацыянальнай дамінантай прагучалі ў яго творах.

Маладога творцу з Берасцейшчыны падтрымлівалі Анатоль Астрэйка, Янка Брыль, Максім Танк. Вядомым беларускім паэтам ён стаў яшчэ ў 1960-я гады, калі выйшла першая кніга вершаў «Непазбежнасць» (1967). Другая кніга паэзіі «Правінцыйныя фантазіі» (1995) знайшла найвышэйшае прызнанне — была вылучана пісьменнікамі краіны на Дзяржаўную прэмію. Ды чыясьці злосная і зайздросная рука выкрасліла з лаўрэацкага спіса імя паэта...

Шукаючы натхненне і гармонію ў жыцці і людзях, спаталяючы боль і самоту, лекаваўся вандроўкамі і алкаголем... Ён часта пакідаў сямейную ўтульнасць, сваіх каханых жанчын і дзяцей: дачку Святлану (1962 г.н.) у першым, яшчэ студэнцкім шлюбе, а потым і сына Андрэя (1967 г.н.) — у наступным. (Дарэчы, дзеці М. Купрэева пазнаёміліся і сябруюць.) Ехаў «куды душа скажа» (М. Купрэеў). Цягу да дарог, вакзалаў, вандровак ён тлумачыў прагай волі, жаданнем быць свабодным…

Жыццё М. Купрэева скончылася 17 верасня 2004 года ў доме састарэлых у вёсцы Лясная, што недалёка ад Баранавіч. Але жыццё яго твораў яшчэ толькі пачынаецца. Сёння даводзіцца, як гэта часта бывае, са спазненнем усведамляць, якая адметная асоба была з намі побач, у адным з намі часе і прасторы… Пра М. Купрэева слушна напісаў яго сябар Л. Галубовіч: «*Ён выбіраўся з традыцыйнага беларускага балота на выспу шырокага светагляду, мосцячы гаць лаўжамі ўласнага жыццёвага вопыту, — ішоў сваім натуральным, а не інтэлектуальна запазычаным з Усходу ці Захаду шляхам. Хоць, безумоўна, вучыўся і браў урокі шмат у якіх творцаў свету*».

Творчая спадчына М. Купрэева яшчэ не сабрана і не выдадзена цалкам. У найбліжэйшы час неабходна выявіць яго творы, раскіданыя па розных перыядычных выданнях. Прафесійнай тэксталагічнай увагі патрабуе архіў пісьменніка, перададзены сынам Андрэем у Ганцавіцкі раённы краязнаўчы музей. Аўтару гэтых радкоў сын перадаў шэраг чарнавікоў вершаў, перарваных папалам, якія М. Купрэеў намерваўся знішчыць. З цяжкасцю, але яны чытаюцца, хоць і пісаны-крэслены алоўкам. Андрэй перадаў нам таксама пранізліва-кранальную перапіску М. Купрэева-мужа з каханай жонкай Святланай Ягораўнай Ежанковай — матуляй Андрэя. (Гэтыя дакументы захоўваюцца ў адукацыйна-асветным цэнтры імя У. Калесніка на філалагічным факультэце Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна.)

Не ручны, не прыручаны нават каханнем, жанчынай, сям'ёй, ён і сёння застаецца для нас чалавекам-загадкай. Ці ўсё ён дапісаў пра сябе? Ці ўсё, што хацеў, сказаў нам? І гэта праніклiва адчулі сябры пісьменніка, паставіўшы на яго магіле ў Міханавічах (прыгарад Івацэвічаў) помнік з купрэеўскімі роспачна-элегічнымі радкамі «*О, як многа я хацеў вам сказаць…*»

Міхась Рудкоўскі, Мікола Купрэеў, Анатоль Гарай. 1960-я гг.

Лісты да жонкі Святланы Ежанковай (з ёй М. Купрэеў быў у шлюбе з 1966 па 1970 г.), фрагменты якіх прапануюцца чытачам, пісаліся ў 1967 г., калі маладая сям'я была шчаслівая нараджэннем сына, калі ў Мінску выйшла першая кніга паэзіі «Непазбежнасць» і М. Купрэеў адчуў сябе сапраўдным паэтам, перад якім адкрываюцца творчыя перспектывы. Ён збіраўся пераехаць з сям'ёй на сталае жыхарства ў Мінск, уладкавацца на працу ў сталічным выдавецтве, шукаў прапіску, будаваў планы на будучае шчаслівае сумеснае жыццё… Але гэта аказалася няпростай справай...

Ён быў іншы. Жонка, якую М. Купрэеў пяшчотна называў Ланушкай, шчыра верыла, многа даравала, пісала лісты, падтрымлівала сваім каханнем і клопатам. Восенню 1967 г. М. Купрэеў пагадзіўся на лячэнне ад алкагольнай залежнасці ў працоўным прафілакторыі (пас. Гарадок Пінскага раёна). Лісты даюць уяўленне аб драматызме жыцця М. Купрэева і яго блізкіх, але найперш — гэта лісты аб каханні і любові пяшчотнага мужа і бацькі…



Аўтограф М. Купрэева.

«***26 апреля 1967 г.:*** *Дорогая моя Ланушка, здравствуй! Пишу только 26-го, потому что вчера ничего не было, да и сегодня фактически — то же. Тот человек сказал придти в пятницу. Но, по всей вероятности, не пойду. И вообще мне всё это надоело. Хочу к вам с Андрейкой. Тут меня утешают тем, что, дескать, некоторые приписываются по полгода, по году. Я сейчас тут сижу в издательстве, только что разговаривал с Велюгиным и Бородулиным. Они подали мне хороший совет: идти в Союз писателей с просьбой, чтоб прописали в доме творчества писателей в Королищевичах (от Минска 30 км.). Собираюсь идти, пойду, в конце концов, к Брылю или Шамякину. Чувствую, что, может, получится. …*

Да, Ланушка, и забыл: книга моя уже вышла, у меня в кармане — сигнальный экземпляр. Скоро выйдет массовым тиражом. Обложка мне не понравилась, хоть и соответствует немного замыслу».

«***20 мая 1967 г.:*** *Здравствуй, Ланушка! Честное слово, не знаю, с чего и начать. Вот сижу один в доме Филатова (друг М. Купреева, живет в посёлке Муховец в пригороде Бреста — З.М.), как и вчера и позавчера. Только что кончил стирку. Ничего не делается, только курится. Да вот слышу за окном похоронную музыку — кого-то несут. А мне кажется, что это по мне оркестр старается.*

Вчера был для меня такой страшный день, какого еще никогда в моей жизни не было. После разговора с тобой я словно окаменел. Сидел как дурак возле телефона и ничего не соображал, не думал, не знал. Пустота заполнила всего и всё вокруг. А до разговора с тобой было вот что. Сидел я в кабинете на брестском радио и думал, с чего начать работу. Входит председатель комитета по радиовещанию и телевидению Панкова и спокойно говорит: "Купреев, мы вас на работу не принимаем. Я выяснила вчера все обстоятельства". Я выслушал ее спокойно, потому что когда она позавчера мне сказала "Пишите заявление, заполняйте документы и — работайте", — я был уверен, что это какое-то недоразумение: ведь прежде, чем взять на работу в такую организацию, об этом сообщается в отдел пропаганды и агитации обкома партии (Залесский — зав. отделом)…

…Спасибо Колеснику за моральную поддержку. Я всё ему вчера рассказал — и про историю с работой, и про личную мою трагедию. Он взялся как одержимый помочь мне, сказал вчера, что пойдет к Шабашову и к Залесскому. Если бы не Колесник, не знаю, как бы я всё это перенёс, как не знаю, как всё это я ещё перенесу. И вот Филатов ещё всё предоставил мне в своём доме… Сегодня уже 20-е. Скоро 25-го. Через пару дней поеду в Минск с заездом в Ивацевичи только потому, что нужно… взять рубашки да оформиться в Союз (пусть будет память хоть о том, что всё-таки был членом Союза советских писателей). А что будет после 25-го (день моего рождения — как смешно!) — пока не знаю. Неужели это всё, Ланушка? Я знаю, что принёс много горя тебе, матери, отцу. Себя не жалко. Жалко всех вас, обидно за то, что какой-то Купреев нарушил ваш покой. Как хочется всё начать по-новому, буквально всё, начав с какой-то определенной точки. Знаю, что хватило бы силы, хватило бы духу, но всё уже слишком, оказывается, поздно...»

Из областной психоневрологической больницы (Городок, Пинский район, Брестская область):

«***12 ноября 1967 г.:*** *Милая моя, здравствуй! …*

Беда моих последних времён в том, Ланушка, что мечусь я между двух огней, между двух берегов — между любовью (какой? — ты знаешь) к тебе и сферой далеко не личной, сферой с целями моими, которые не могут осуществиться в силу конфликта, неприемлемости между требованиями объекта и характером, индивидуальностью субъекта, т.е. меня. И вот видишь, как получается: от отсутствия возможности направить свои творческие желания по своему, внутренне мне необходимому руслу у меня бывают тематические падения — например, к трагическим ситуациям в стихах. От тебя я часто убегал в "общество", надеясь (не веря, правда, в эту надежду) найти пищу отнюдь не сердечную и всякий раз убеждался, что в век беспокойной комфортабельности что-либо другое найти трудно (кроме вина мокрого и сухого) — это было и в Бресте, и в Минске, и там, где я жил или наедине, или одиноко.

В палате, где я "обитаю", — 8 человек, наблюдаю за ними и даже немного радуюсь, что я не так уже страшно болен, как многие из них, а только обидно и страшно за то, что за своих последних сознательных десять лет мог сделать куда больше того, что сделал, и ради обратного этому стоит, конечно, покончить с моим "злоупотреблением", достигшем апогея за последний год. Видимо, правы очень те, которые (это — философы) утверждают, что нельзя понять людей, мир, принять их, не поняв до конца и не вобрав до полного слияния (ткань в ткань) самого себя, своих самых близких и дорогих людей. Мне, как и всегда, когда я вдали от тебя, хочется только одного раз и навсегда: держать в объятьях тебя и сына, держать вас, если бы это было возможно, в горсти, как держат в горсти пойманных тёплых, притихших и трепетных птиц. …И потому-то я всегда возвращался к тебе — каким бы я ни был, самим собой, — к тебе, родная… Одна картина, которая… всегда, когда вспомню, больно тревожит: ты одна остаёшься в лесу, а я, оглядываясь и борясь с собой и не понимая до конца, что со мной творится, ухожу на Грабовцы (в Ореничах). Знал (и в том случае и позже), что люблю тебя — потому всё будет на месте, мир не перевернётся, окунусь в другие "галактики", вернусь и буду любить еще сильнее и, может, больше. Знал, что нарушаю константу в самом себе, в близком человеке, в семье. Больше не хочу, чтоб все эти константы нарушались...

Твой Коля».

Хутка міне паўтара дзясятка гадоў, як не стала М. Купрэева. Шчымліва сціскаецца сэрца: так і пайшоў, цалкам не спазнаны і незразуметы намі... Горка і шкада, што яму часта было няўтульна і самотна сярод нас, якія шанавалі яго талент і творчасць і любілі яго.

Зоя МЕЛЬНІКАВА,
прафесар Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна

Планеты адкрыццяў і дасягненняў

Звялікай радасцю пісьменнікі Брэстчыны чакаюць юбілейнага — 25-га па ліку — Дня беларускага пісьменства, які адзначацца ў палескім Іванаве, ды яшчэ пад светлымі крыламі Года малой радзімы: лёс многіх творцаў суполкі так ці інакш звязаны з гэтым невялічкім прыгожым мястэчкам.

У раёна багатая літаратурная гісторыя. Звязана яна не толькі з прозвішчамі Дастаеўскага і Орды. У вёсцы Магільна, якая даўно злілася з Іванавам, нарадзіўся знакаміты беларускі пісьменнік, паэт і перакладчык эпохі Рэнесансу Ян Пратасовіч, кнігі якога былі надрукаваны ў выдавецтве Яна Карцана і маюць выдатнае мастацкае афармленне. Але чым багаты рэгіён цяпер? Распавядае старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі **Таццяна Дземідовіч**:

ПРА ТВОРЧЫЯ ТРАДЫЦЫІ

— З 1965 года пры іванаўскай раённай газеце «Чырвоная звязда» існуе літаратурнае аб'яднанне «Ясельда», ля вытокаў якога стаяў пісьменнік з Драгічыншчыны, аўтар шматлікіх дакументальных кніг Мікола Панасюк. Менавіта «Ясельда» стала творчай калыскай для вядомага паэта, члена Саюза савецкіх пісьменнікаў Міколы Федзюковіча. Іванаўская зямля ганарыцца літаратурнымі набыткамі пісьменніка і журналіста Анатоля Крэйдзіча, які ў сваіх творах услаўляе родны край, яго таленавітых і працавітых людзей.

У розныя часы на Іванаўшчыне працавалі такія вядомыя пісьменнікі, як Алесь Крыга, Мікола Купрэеў, Мікола Трафімчук, Уладзімір Сітуха. Сёння літаратурную скарбонку Іванаўшчыны ўзбагачаюць паэты Валерый Кухарчук, Андрэй Мазько, пісьменнік-натураліст і паэт Васіль Жушма, празаік-публіцыст Анатоль Дзенісейка.

ПРА ЛІТАРАТУРНУЮ БЕРАСЦЕЙШЧЫНУ

— Сёння ў Брэсцкім абласным аддзяленні 52 літаратары. Большасць з іх — лаўрэаты прэстыжных літаратурных і журналісцкіх прэмій і конкурсаў. Найстарэйшы член літаратурнай суполкі — ветэран Вялікай Айчыннай вайны, пісьменнік-дакументаліст Васіль Літвінчук, якому сёлета споўнілася 88 гадоў. Самая маладая пісьменніца Алена Гневушава ўступіла ў Саюз пісьменнікаў Беларусі ў дваццаць адзін год.

Штогод літаратары брэсцкай суполкі выдаюць больш за дзясятак кніг, актыўна друкуюцца ў рэспубліканскай і замежнай прэсе, удзельнічаюць у міжнародных форумах, фестывалях, навукова-краязнаўчых праграмах і канферэнцыях, выступаюць у школах, бібліятэках, працоўных калектывах, вайсковых часцях, музеях, кніжных крамах. А такія святы, як «Лунінская восень», фестываль рускай паэзіі «Мы рождены для вдохновенья», Сусветны дзень паэзіі з гучаннем вершаў на розных мовах, прыцягваюць вялікую аўдыторыю.

З 2007 года лепшым літаратарам уручаецца прэмія аблвыканкама імя Уладзіміра Калесніка. У рамках літаратурнага праекта «Фарбы Берасцейшчыны» запрашаюцца на сустрэчы з чытачамі пісьменнікі з глыбінкі. Новымі праектамі сталі беларуска-ўкраінская гумарына «Смех заваёўвае сусвет», адкрыццё літаратурнага салона «Жывапіс. Музыка. Літаратура». У атмасферы казачнасці адбылося адкрыццё «Літаратурнай альтанкі». Раз на два месяцы выходзіць інфармацыйны бюлетэнь «Літагляд» тыражом 100 экзэмпляраў, у якім друкуюцца кніжныя навінкі нашых пісьменнікаў. Унікальным набыткам стаў выдадзены на пачатку 2018 года біябібліяграфічны даведнік Брэсцкага аддзялення СПБ «Творчы партрэт пісьменніцкай суполкі», складальнікам і рэдактарам якога з'яўляецца брэсцкая паэтэса Надзея Парчук. Цудоўным падарункам для пісьменнікаў і чытачоў стане выпуск анталогіі аддзялення, у якой убачаць свет творы ўсіх членаў суполкі. Акрамя гэтага, мы чакаем выхаду літаратурнага альманаха «Берасцейская скарбніца», рэдактарам і ўкладальнікам якога стаў пісьменнік Сяргей Белаяр. Пры гэтым робім намаганні, каб папулярызаваць творчасць нашых пісьменнікаў і ў інтэрнэце. З чэрвеня пачалі праект «Нашы пісьменнікі ў Вікіпедыі».

З 2012 года склалася добрая традыцыя — Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі ўзнагароджвае рэдакцыі газет, радыё, тэлебачання і асобных журналістаў за іх уклад у развіццё літаратурнага працэсу Брэсцкай вобласці, прапаганду творчасці пісьменнікаў Брэстчыны. Унікальнай крыніцай ведаў, літаратурнай гасцёўняй стаў для мясцовых літаратараў і Брэсцкі раённы краязнаўчы альманах «Астрамечаўскі рукапіс», рэдактарам і ўкладальнікам якога з'яўляецца вядомы брэсцкі пісьменнік Аляксандр Валковіч.

ПРА МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ МОЛАДЗІ

— На працягу навучальнага года пры аддзяленні працавала школа маладога літаратара. Сёлета пабачыў свет зборнік юных паэтаў і празаікаў «Адкрыццё-2018». Удзельнікамі творчага праекта сталі пераможцы літаратурнага конкурсу Брэсцкага абласнога аддзялення СПБ, прысвечанага 135-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Сумесна з філфакам Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна ў мінулым сезоне ўпершыню быў праведзены конкурс «Маладая літаратурная крытыка», а самыя юныя таленты мелі магчымасць паўдзельнічаць у конкурсе чытачоў «Зорны спеў». Упершыню дзеці чыталі творы выключна берасцейскіх паэтаў і празаікаў. У кастрычніку плануецца новае літаратурнае спаборніцтва для юных талентаў. Дапамагаюць іх узрошчваць і літаратурныя клубы. Сябар нашай творчай суполкі Таццяна Шульга працуе са студэнцкай творчай моладдзю Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта. Яе выхаванцы не аднойчы станавіліся пераможцамі рэспубліканскіх літаратурных конкурсаў. У Брэсцкай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А.С. Пушкіна працуе клуб «Адкрыццё», які ўзначальвае вядомая пісьменніца Зінаіда Дудзюк. Працягвае працу пры падтрымцы Саюза пісьменнікаў Беларусі літаратурны клуб «Літара» на базе Гарадскога цэнтра культуры. На Століншчыне паэтэса Галіна Бабарыка ўзначальвае літаратурны клуб для юных творцаў «Мастацкае слова». У апошнія гады ярка заявілі пра сябе лунінецкі творчы гурток «Муза», літаратурны клуб «Пінчукі» пры Пінскай раённай бібліятэцы імя Я. Янішчыц, кіраўніком якога з'яўляецца Марыя Ляшук. Пры гэтым Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі кантактуе са шматлікімі літаратурнымі клубамі пры школах, сельскіх клубах.

Таццяна Дземідовіч.

Адораных юнакоў трэба шукаць, заахвочваць, усебакова падрымліваць. Сёння для моладдзі — час вялікіх магчымасцей. І вельмі прыемна ў ліку прызёраў нашых літаратурных спаборніцтваў бачыць пераможцаў рэспубліканскіх алімпіяд па беларускай мове, студэнтаў тэхнічных ВНУ, будучых урачоў, маладых музыкантаў, мастакоў. Сталыя ж творцы больш канцэнтруюцца на сваёй творчасці, спяшаюцца хутчэй выдаць кнігі, перадаць маладому пакаленню жыццёвы досвед, падзяліцца мудрасцю, парадамі.

ПРА СУСТРЭЧЫ ПАДЧАС СВЯТА

— Напярэдадні Дня беларускага пісьменства творцы Брэсцкага абласнога аддзялення наведалі Іванава. Сустрэча з чытачамі адбылася ў раённай бібліятэцы. Гэта дало магчымасць загадзя прасякнуцца атмасферай свята.

Галоўныя выступленні сяброў абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі адбудуцца ў павільёне «Слова пісьменніка» цягам двух дзён. Тут зладзяць выстаўку карцін берасцейскіх пісьменнікаў-мастакоў Мікалая Бусько і Анатоля Галушкі пад назвай «Фарбы малой радзімы», на стэндах будуць прадстаўлены кніжныя навінкі брэсцкіх пісьменнікаў, у тым ліку і краязнаўчая літаратура. Насычаная праграма з удзелам маладых пісьменніц Вольгі Сандрыкавай і Алены Папко «Казкі маёй Радзімы» чакае маленькіх кнігалюбаў. Пісьменнікі Брэстчыны возьмуць удзел у міжнародным круглым стале, прысвечаным Году малой радзімы і перакладчыцкай дзейнасці, навукова-практычнай канферэнцыі «Іванаўскія чытанні». У рамках рэспубліканскага свята раскрыецца інтрыга, хто стане пераможцам літаратурнага конкурсу «Духоўная веліч», які праводзіцца ўпершыню абласным аддзяленнем СПБ сумесна з Брэсцкай і Пінскай епархіямі і аблвыканкамам.

ПРА ЗАХАПЛЕННЕ АСОБАМІ

— Кожны сябар нашай творчай суполкі — выбітная асоба, знакамітасць у сваім раёне, яркая планета адкрыццяў і дасягненняў. Пра творчасць кожнага пісьменніка я магу расказваць гадзінамі. Дарэчы, Брэсцкае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі ў бягучым годзе прадставіла на Нацыянальную літаратурную прэмію рэкордную колькасць заявак у розных жанрах. Гэта сведчыць аб тым, што пісьменнікамі суполкі ў апошні час напісана нямала вартых увагі кніг. Прычым пераважная большасць грунтуецца на мясцовым матэрыяле і прысвечана малой радзіме.

Яна БУДОВІЧ

Ля чыстай Ясельды-ракі…

Больш за паўвека мінула з таго часу, калі аўтар гэтых радкоў толькі-толькі збіраўся паступаць на факультэт журналістыкі БДУ імя У. Леніна, як тагачасны рэдактар іванаўскай раёнкі Аляксей Каўко запрасіў мяне на працу ў новае газетнае выданне «Чырвоная звязда» ў Палескім краі. «Трохі папрацуеш у нас літсупрацоўнікам, а потым будзем рэкамендаваць цябе для паступлення на вучобу…» І тут жа — у службовым кабінеце — атрымаў працоўную кніжку, адзіную ў маім жыцці. «Чытаў твае вершы. Някепска. У найбліжэйшых нумарах на-друкуем. А заадно неабходна стварыць літаратурнае аб'яднанне. Падумай над назвай», — дадаў ён.

Маёй радасці не было межаў. Аляксей Трафімавіч са мной, учарашнім школьнікам і актыўным селькарам, гаварыў на роўных. Не хаваў рэдактар і свайго захаплення прыгажосцю палескай Ясельды-ракі. Бо сам быў родам з Міншчыны, з в. Міраслаўка Бярэзінскага раёна.

— А што калі так і назваць літаб'яднанне — Ясельдай? Няхай пад такой назвай выходзіць і літаратурная старонка?..

У гэты ж дзень я быў адухоўлены яшчэ і тым, што беражліва захоўваў у бацькоўскім доме некалькі дзясяткаў пранумараваных канвертаў з лістамі будучай вядомай паэтэсы Яўгеніі Янішчыц. Наша перапіска завязалася ў той час, калі я і Жэня былі яшчэ школьнікамі. А пазнаёміліся мы завочна праз вершы, бо шаснаццацігадовая паэтэса ўжо друкавала іх у беларускіх газетах і часопісах.

Завязалася не толькі перапіска, але і, як пазней заўважыла Зінаіда Дудзюк, моцнае сяброўства. Неабходна адзначыць, што Жэня патрабавальна і тактоўна разбірала творы свайго завочнага сябра, дасылала ў канверце і свае новыя вершы. Сярод іх быў і такі:

Сцежкі майго краю,
Мне па вас прайсці!
Я адну жадаю
Выбраць у жыцці.

Якраз гэты верш я і зачытаў на першым арганізацыйным пасяджэнні літаратурнага аб'яднання, прапанаваў: то хай так яно і называецца — «Ясельда», там жа, ля гэтай ціхай і прыгожай ракі, жыве і Жэня Янішчыц з вёскі Рудка Пінскага раёна...

Дарэчы, свае вучнёўскія вершы даслала ў рэдакцыю і Ганна Сідарчук з в. Буса. Яна таксама — ясельдзянка…

Дамовіліся збірацца адзін раз у месяц, у асобным сшытку весці спіс усіх сяброў літаб'яднання. А яшчэ — не толькі абмяркоўваць новыя творы, але і па магчымасці выступаць у школах, працоўных калектывах. Найстарэйшым з удзельнікаў літаб'яднання быў настаўнік беларускай мовы Моладаўскай сярэдняй школы Васіль Туркевіч, да слушных заўваг якога прыслухоўваліся ўсе астатнія. Някепскім дарадцам у такіх пасяджэннях заставаўся ўжо вядомы ў той час паэт Мікола Федзюковіч з суседняга Драгічынскага раёна. З 1962 па 1965 год ён служыў у Савецкай Арміі, а потым скончыў Літаратурны інстытут імя А.М. Горкага ў Маскве, працаваў у выдавецтве «Народная асвета». А таму карыстаўся вялікім аўтарытэтам як у рэдактара раённай газеты, так і ў тых, хто дэбютаваў на яе старонках з вершамі. Прыкладна ў гэты час і пабачыў свет яго невялічкі зборнік вершаў «Зямля-магніт».

Менавіта яна, іванаўская зямля, і стала для многіх пачынаючых творцаў такім прыцягальным магнітам. Невыпадкова Дзень беларускага пісьменства адзначаецца ў Іванаўскім раёне, дзе жыве шмат таленавітых пісьменнікаў-палешукоў, беларускамоўных творцаў.

Мікола ПАНАСЮК,
былы старшыня літаратурнага аб'яднання «Ясельда», член Саюза пісьменнікаў Беларусі, г. Брэст

«Туганавічы. Сядзіба Верашчакаў» 1876 г.
Від з боку пад'езда. Палац аднапавярховы, з порцікам і тэрасай на калонах, у глыбіні — аднапавярховая афіцына з ганкам. Малюнак створаны алоўкам, падпраўлены акварэллю.

Пятроў дзень

Апавяданне

Валерый ГАПЕЕЎ

Іна прыехала з вакзала на таксі, а не выклікала Пятра па тэлефоне. Зайшла ў кватэру — трохі схуднелая, загарэлая. І чужая. Яе твар спыніў памкненне Пятра абняць жонку, а яна, не зрабіўшы кроку ад парога, выдыхнула суха, мабыць, даўно падрыхтаваныя словы:

— Адразу скажу. Я пакахала іншага. Так здарылася. Прабач, але я хачу жыць напоўніцу, а не існаваць у сумнай шэрасці.

Ён не абмовіўся.

Іна папрасіла, каб пацярпеў: заўтра ехаць да сына ў вёску. Было ж дамоўлена: пасля яе двух тыдняў у санаторыі, два тыдні яны разам у яе бабулі, дзе цяпер сын. Пятро не запярэчыў — патрывае дзеля сына. Ён упусціў у розум вестку пра катастрофу свайго жыцця, як прымаюць людзі смерць родных людзей: адразу і напоўніцу. Без спроб узняць нябожчыка з труны.

Заўважыў, не сляпы: Іна за апошнія гады пахаладнела, знікла яе колішняя гарэзлівасць. Падманваў сябе: пасталела. Але час ад часу ў сварках яна дакарала: абрыдла будзённасць. Вось і дамовіліся пра санаторый...

Ноч прасядзеў на балконе, курыў.

Калі пад'язджалі да вёскі, ён сказаў першыя словы ад таго моманту, калі пачуў прызнанне Іны:

— Прыдумляй там сама, як спаць… не разам жа.

Іна здрыганулася, моўчкі кіўнула.

Хата бабы Волі, крайняя самая, стаяла пад вартай трох высачэзных дубоў. У іх цяньку Пятро і паставіў аўтамабіль. Баба выйшла з веснічак, сухенькая, згорбленая, з двума гладкімі кіёчкамі ў руках, але рухавая. Позірк цёмных, не выцвілых дагэтуль вачэй, заўсёды крыху бянтэжыў Пятра. І зараз глянула баба, як прачытала самае важнае на яго ілбе. Цёмка прыбег аднекуль з агарода. Сустрэча як сустрэча. Толькі даўжэй, чым раней, прыціскаў да сябе сына.

Выгрузіліся. Пасля абеду Пятро распытаў сына пра справы, ці не нудзіцца тут, і пайшоў падрамаць у дальні пакойчык. Нечакана для сябе заснуў, як праваліўся. Калі расплюшчыў вочы, зразумеў — вечарэе. На цеснай куханьцы зачарпнуў вады і не данёс да рота, застыў — праз расчыненае акенца данеслася гамонка.

— Добра, добра… А то я не бачу! — казала баба Воля.

— Што бачыш, бабуля? — змучана адказала Іна.

— Бачу, што табе ў сабакі вочы пазычаць трэба, а твой Пятрок ходзіць як пад зямлёй!

— Не мой ён ужо…

— Што ты кажаш, як пугай па вадзе пляскаеш?

— Бабуля… Не адна я вінаватая.

— Бач ты! Не вінавата Агата, што легла пад Ігната!

— Баба Воля! — падвысіла голас Іна. — Не лезь…

— Я не лезу! А як улезу, дык такое ўраблю, забудзеш, што дзеўкай нарадзілася! Ты мяне ведаеш!

Стала ціха. Адно было чутно, як шапаціць гуркавінне.

Курыў на двары, падскочыў Цёмка:

— Тата! Баба Воля ведае, дзе можна рыбу кошыкам лавіць! Але каб з табой! Хадзем!

Выйшлі за агарод, прайшлі сцежкай па лузе. Наперадзе стаялі купай вербы. Калі падышлі бліжэй, адкрыўся нібыта круглы пляц у атачэнні дрэў. Зарослы кустоўем, крапівой, травой, гадамі нікім не кошанай. Ля вербаў — упаўшыя старыя дрэвы, сухое голле. У верхняй частцы пляца, які хіліўся да бачнай адсюль невялікай рэчкі, грувасцілася зарослая горка, у ніжняй — невялікая круглая яміна, гэтаксама зарослая.

Але занядбанасць гэтага месца не магла перамагчы адчуванне асаблівасці яго. Пятрок спыніўся на «ўваходзе» пляца, разгублена агледзеўся.

— Што? — пытліва ўскінула на яго вочы баба Воля.

— Ды вось… Каб ведаў, што значыць слова намоленае, дык пра гэтае месца так і сказаў.

— Пятроўшчына ета наша. На Пятроў дзень, праз тыдзень будзе, усёй вёскай тут збіраліся, колькі сябе помню. Прыносілі, хто што меў. На арэлях на вербах гушкаліся, песні, прыпеўкі спявалі. Розныя… — зморшчаны тварык бабы раптам пасвятлеў, гарэзліва бліснулі вочы і яна чыстым голасам праспявала:

— Ух-ух! Люблю двух!

Пагляжу — адна ляжу!

Замаўчала, паківала галавой.

— Усё мінулася. Жыццё прабегла як май змаяваў… Весела было, па-людску. Нехта і ўсю ноч гуляў. А што ж, у Пятрову ноч кожны кусцік начаваць пусціць. А пачалі з тым п'янствам змагацца, дык быў у нас такі Сахно, старшынька, усё вынішчыў. Няма крынічкі, хай яму на тым свеце спакою не будзе…

— Крынічка тут была?

— А чаго б мы на пустым месце збіраліся? Была… Няпростая крынічка. Дзе тая куча з бадыллём — там была. Цяперака нікому не трэба…

Цёмка ўжо церабіў сцежку сярод зарасніку да той гары. Падышоў і Пятро.

— Тата, а крыніца — гэта вада з зямлі, так?

— Так, сынку.

— З яе рэкі пачынаюцца? А вада халодная і смачная? А чаму не б'е цяпер?

— Бо завалена… — Пятро абыходзіў гару, прысеў, гукнуў сына: — Бачыш, тут зямля вогкая… Значыць, жыве…

І раптам уявілася, выпукла і яскрава: недзе там, глыбока пад непатрэбшчынай і смеццем жыве сапраўднае, чыстае і светлае, імкнецца да свету — і не можа знайсці выйсце…

— А раскапаем? — сын, здаецца, ужо забыўся на рыбу, вочы заззялі ад новай цікавосткі.

— Трэба падумаць… Але пайшлі рыбу лавіць.

На пакатым схіле рэчкі баба і Іна рвалі шчаўе, Пятро з сынам, распрануўшыся, спрабавалі ў плыткай рацэ кошыкам шураваць пад берагамі — баба ўпэўніла, што ўюны там павінны быць. І праўда, злавілі трох, вяртлявых, бы вужакаў. Сын, выцягнуўшы чарговы раз пусты кошык, сказаў нечакана:

— Ай ну іх, хай жывуць! Пайшлі крынічку раскопваць!

Пятрок усміхнуўся: бач, не толькі ў яго ў галаве засела тое месца.

На зваротнай дарозе зноў прыпыніліся на Пятроўшчыне, Пятро спытаў:

— Баба Воля, мне каб касу… Не самую лепшую, бо тут бадылле. А сякерка ды рыдлёўка ці ёсць добрыя?

— А нашчо табе? — не здзівілася, а нібыта ўзрадавалася старая.

— Дык… Калі ўжо раскопваць крынічку, каб да ладу і месца давесці. Праўда ж, сыне?

— Ага, расчысцім! І арэлі павесім! — загарэўся сын. — І маму пагушкаем!

— Я сваё адгушкала, — ціха выдыхнула Іна, дадала з папрокам у бок Пятра: — Хай адпачывае дзіця, калі табе няма чым заняцца…

— Я з татам буду! — нечакана рашуча, з крыўдай выгукнуў сын, і Іна на імгненне змянілася з твару, пасля кранулася галавы сына і ціха прамовіла:

— Добра, сынок, працуйце…

Баба борздзенька патупала ў сяло і вярнулася з мужчынам гадоў сямідзесяці, з сівой, лапатай, барадой. Ён нёс касу. Парукаліся.

— Мяне Ігнатам клічуць. Часцей мянташ, па расе пачні… — параіў і працягнуў мянташку.

Пятро прачнуўся назаўтра сам да ўсходу сонца. Касілася добра, хоць раз-пораз спыняўся, каб падсекчы чарговы кусцік крушынніку ці вербалозу. Большыя кусты пакідаў на пасля. Узмакрэў хутка, азірнуўся — чысты лапік ззаду быццам дакараў: навошта ты ўзяўся? Пабачыў, як ад вёскі калыхаецца постаць. Пазнаў учарашняга Ігната па барадзе. Той ішоў з касой. Павітаўся, без слоў пачаў пакос. Касілі моўчкі з паўгадзіны, пасля Ігнат паклаў касу:

— Курым, Пятро… Не тыя гады…

Прылёг бокам на пакос, зняў палатняную кепку з галавы, агаліўшы белую лысіну, выцер твар.

— От кажуць: не чапай тое, што людзьмі шануецца. Раз людзям яно трэба, значыць, недарэмна прыродай створана, так?

— Мабыць, так, — кіўнуў Пятро, не разумеючы, да чаго гаворка.

— Сахно ўсё выслужыцца хацеў. Прыляцеў на Пятроўку той раз злы, бы сабака. Яго бабы чарачкай ды прыпеўкамі вітаюць, а ён мацюкамі на ўсіх. І назаўтра жвіру самазвал на крынічку вываліць загадаў. А яшчэ колькі прычэпаў гною з фермы… А колца верхняе ж, глядзі, сабе звалок на двор. І дзе той Сахно, дзе яго ўсе? Крынічка ж жыве, бачыў?

— Бачыў… А што з Сахном?

— У зямлі… Жонка раней на рак захварэла, памерла. Сыны, двое, студэнтамі на Каляды напіліся, адзін другому з бацькавага ружжа ў жывот стрэліў. Той у магілу, другі — у турму. А дачка прыгажуняй вырасла, зацяжарыла, хацела дзіцяці пазбавіцца крадком, ледзь адкачалі. Ды з галавой нешта стала, то ў псіхушку... Так Сахно і застаўся адзін. Апошнія гады сам з глуздоў з'ехаў, людзі падкормлівалі… Скажаш, само па сабе злёсавалася?

Калі сонца пачало грэць у спіну, прыбег запыханы Цёмка, з крыўдай:

— Тата, а чаму мяне не пабудзіў? — і працягнуў вузельчык: — Мама снеданне зрабіла! Аладкі, смятана, яешня.

— О, будзем снедаць, сядайце, дзядзька Ігнат! І ты сядай, сын. Хопіць і табе работы — во пракосы раскінеш, хай сохне хутчэй…

Да абеду выкасілі пляц, пачалі выкарчоўваць кустоўе. Прыйшла, спорна перабіраючы кіёчкамі, бы лыжнымі палкамі, баба Воля, з ёй — яшчэ жанчына, мажная, у гадах.

— Гэх, мая прыперлася! — пабачыў Ігнат жанчын. — Як старастай абралі, няма маім рукам спакою. Ганна, квасу нясеш? — гукнуў да жонкі.

— А нясу, нясу, Ігнатко! — жанчына прыўзняла клуначак, які трымала ў руцэ, звярнулася да Пятра: — А здароўце вам! От, малайчынка вы, такое пачалі! К вечару людзі будуць, усіх зганю, камандуйце адно!

К вечару, папраўдзе, на Пятроўшчыне было чалавек дваццаць вяскоўцаў, пенсіянераў, больш жанчыны. Ды яшчэ купка дзятвы.

Іна прыйшла і шчыравала разам з іншымі, поруч з сынам.

Пятроўшчына быццам заварушылася ўся разам, пачала прыбірацца, прыхарошвацца. Назаўтра ачысцілі кучу зямлі на месцы крыніцы. Пятро прысеў, стомлены, закурыў. Падышла баба Воля.

— Тую яміну пачысціць трэба.

— Дык мо во зямлёй гэтай яе завалім…

— Нельга, пачысці, кажу, — цвёрда загадала баба. — Раўчук з крынічкі туды бегчы павінен.

— Каб купацца там?

— Для баб копанка…

Чаму для іх — Пятро не стаў пытаць. Можа, мыць-паласкаць.

Стараста цётка Ганна прыпынілася:

— Пятро, у нас фермер е адзін, гуркі вырошчвае. А тут жа перагной, дык я яму скажу, ён з трактарком заўтра будзе! І прыбяром кучу, так?

— Давайце так…

Зямлю з крынічкі выбіраў сам Пятро, перавязаны пад пахі вяроўкай — хто ведае, ці не вымыла знізу вада яміну. Ужо з другога колца выбіраў вадкую гразь, апускаючыся ніжэй і ніжэй. Сын, які цяпер не адходзіў на крок, упрасіў: дай і мне паадкопваць крынічку! І, жэўжык, шчыраваў, абвязаны вяроўкамі, напаўняў вядро хутка, ніяк вылазіць не хацеў. Раптам закрычаў радасна-здзіўлена:

— Бачу! Бачу, як вада з зямлі б'е! Ух ты, круціць вінтом!

— То ключ, сынок, — нахіліўся над колцам Пятро. — Вось ты і пабачыў…

Вада ўзнялася хутка, знайшла прабітую дзірку ў ніжнім колцы, пабегла пракапаным ручайком у вычышчаную раней копанку.

Іна прынесла абед у вузельчыку, Цёмка кінуўся ёй насустрач:

— Мама! Мы раскапалі! Вада бяжыць! Спачатку тата чысціў, а я ключ вызваліў! Я ключ бачыў!

Іна прытуліла сына і мо першы раз зірнула ў вочы Пятру — з тугой.

Ставілі верхняе, прыкочанае падлеткамі з Сахновага двара колца, рабілі стрэшку. Дзень за днём — тыдзень мінуў.

Тым часам копанка запоўнілася, вада — што лёд, празрыстая і халодная.

На Пятроў дзень пяклі-смажылі, к вечару баба Воля пераапранулася ў чыстыя спадніцу і кашулю з вышыўкай. На Пятроўшчыне ўжо нехта паспеў першым разаслаць настольнік на траве і выкладаў прысмакі. Хутка ці не ўся вёска сабралася, святочна апранутая. Са стольнікаў розных на траве ўтварыўся пярэсты, доўгі абрус. Граў на гармоніку маладжавы дзядок без двух пальцаў на правай руцэ, а жанчыны адгукаліся прыпеўкамі.

Стараста цётка Ганна з Ігнатам у цэнтр выйшла, той трымаў у руках вялікую пластыкавую бутлю з цёмным напоем.

— А ў нашага Ігната барада калмата! А Ігнат барадой патрасе-патрасе, чарачку паднясе-паднясе, — зацягнула нейкая цётка.

— Першаму хлебнага завадатару нашаму, камандзіру войска пенсіянерскага, шаноўнаму Пятру! — абвясціла стараста, а Ігнат ужо наліваў шыпучы напой у кубак, і вакол загулі ўхвальна, у ладкі запляскалі. Пятро, зніякавелы ад агульнай увагі, застыў, прыабняўшы сына. Цётка Ганна сама паднесла яму напой:

— От табе чарка, каб сышла з хаты сварка, пі наш квасок — каб здаровы быў сынок, выпі яшчэ палову, каб любіў жонку здарову, а дап'еш да канца, каб любіла жонка малайца!

Мусіў выпіць пад вясёлы смех.

…На арэлях гушкалі дзяцей, а пасля самі гушкаліся пад двухсэнсоўныя жартачкі і вясёлы рогат. Разыходзіліся, калі добра ўзяліся прыцемкі. Ці не ўсе па чарзе падыходзілі да Пятра з Інай, між якімі туліўся сын, казалі з пачуццямі:

— Дзякуйце вам! Такую справу зрабілі, хай Бог дае даброт, хай Неба спрыяе!

Пятро паспяваў казаць у адказ: «Усе ж працавалі», але быў расчулены і невыказна рады за сына — такое ён не забудзе…

Іна нечакана азвалася:

— Я пабуду яшчэ тут, вы ідзіце самі кладзіцеся...

Калі сын лёг, Пятро выйшаў у сад, прысеў пад сцяной хлеўчыка на лаве. Хацеў закурыць, але тут зайшла баба Воля, прысела побач.

— Я табе так скажу, Пятро, — пачала яна адразу. — Як навіна якая выпаўзе на лоб вошшу, дык трэба не галаву секчы, а валасы стрыгчы.

Пятро змаўчаў.

— Адно помні: як схочаш дараваць — то шчыра дарэшты даруй. Сынок за табой, што хвосцік. Пра яго думай.

Свяціў поўны месячык. Пятро прыслухоўваўся да сябе, адчуваючы незвычайнае пачуццё: вось, зроблена задуманае, заўтра — ніякага клопату. За тыдзень прывык да турбот…

— Што заўтра рабіць трэба? — ціха спытаў у старой.

— Пераначуем, дык пачуем, — адказала баба.

Рыпнулі веснікі, зайшла з вуліцы і ішла праз двор, заліты святлом месяца, Іна. Чамусьці з мокрымі валасамі. І сукенка з мокрымі плямамі. Купалася недзе? Яна не заўважыла ні яго, ні бабу ў ценю хлява.

Калі за Інай зачыніліся дзверы сенцаў, баба пераможна сцішана выгукнула:

— А казала я табе!

— Што казалі?

— Казала: не засыпай копанку, трэба, каб там вада з крыніцы збіралася. Якраз ночкай Пятроўскай употайкі ў той вадзічцы жанкі цела ад граху любадзейнага адмываюць, а галаву ад дуру. Я табе скажу: няпроста ў тую ваду зайсці, і не кожную тая вада прыме…

Баба пайшла. Пятро сядзеў, уяўляў: сын будзе згадваць гэтае лета — як ён вызваляў з-пад зямлі крынічку, і, прыязджаючы сюды, бегчы яе наведаць.

Курыць расхацелася.

Хацелася чакаць.

Сёння мы прадстаўляем паэтаў, чый лёс звязаны з Іванавам. Некаторыя з іх тут нарадзіліся, іншыя працавалі ў раённай газеце. Так ці інакш, для ўсіх іх малая радзіма пачыналася з берагоў Ясельды.

Анатоль КРЭЙДЗІЧ



Верш пра вёску каля Іванава

Вёска мая — Заверша
Стагі па ўсёй Струзе вершыць.
З двара твайго крок мой першы.
Я да тваіх алешын
Сэрцам прырос, Заверша.
Песня мая — Заверша.
На золку, як сэрца, сонца.
А неба чысцей і вышай,
Чым дзе, у маім Завершы.
Я сцежка твая, Заверша,
Хмурынка над роднай хатай,
Што з цёплага коміна выйшла.
Да скону я твой араты
І зерне тваё, Заверша.

***

І песня абарвалася,
І гоман дня застыў —
Гайдалася, купалася
У хвалях ветру ты.

Шаптала, неспатольная,
пра сонечны сувой:
Сагрэй мяне пяшчотаю
Юначаю сваёй.

О, што са мною сталася,
Што зблытаў над вадой
Бярозку сарамлівую
З дзяўчынай маладой.

***

Прачнецца трывога ноччу,
І я ўскрыкну ад болю.
Сон разарве аднойчы
Жыццё на астрог і волю.

Астрог — гэта ўсе няпраўды,
Падманаў сырая цемень.
Няма аніякай рады
Прабіць таўшчыню сумлення.

А там, за прутамі ў небе
Стралою ластаўка ўецца.
Мне добра ўсвядоміць трэба,
Дзе я на гэтым свеце.

Валерый КУХАРЧУК



Трыялеты

***

Як хораша за вокнамі
сняжыць.
Чарнявы кот
перапыніў прагулку.
Пасля вятроў
прасветлена і гулка.
Так хораша
за вокнамі сняжыць!

Зноў марыць
захацелася і жыць,
І даць кату
прамасленую булку.
Як хораша за вокнамі
сняжыць.
Чарнявы кот
перапыніў прагулку.

***

Супакой маё сэрца,
сынок,
Тумановым сівеючым
ранкам.
Бачыш, б'ецца
саслаблым падранкам.
Супакой маё сэрца,
сынок.

Хай над намі лагоды
дамок
Захінае ад бур
і маланкі.
Супакой маё сэрца,
сынок,
Тумановым сівеючым
ранкам.

***

На могілках спакой
ды дабрачын.
Намолены пагосты
адмыслова.
Не зганьбіць слыху
тут благое слова.
На могілках спакой
ды дабрачын.

Не трэба ні замоваў,
ні прычын,
Каб вечнай існасці
спазнаць высновы.
На могілках спакой
ды дабрачын.
Намолены пагосты
адмыслова.

Андрэй МАЗЬКО

Восеньскі дождж

Зноўку
Вісіць дзяруга
Шэрая
Замест неба.
Плача
Дождж-валацуга —
Дзесьці
Сагрэцца трэба.

Моліць
І просіць шчыра,
Нібы жабрак
Галодны,
А па зямлі
Маршчыны
Ад ручаёў
Халодных.

Ды зачынілі
Вокны.
Гасне
Святло-вуголле...
Рвуцца
Яго валокны
Аб парканы
І голле.

ХЛЕБ

Мінулае
Не падмане, не здрадзіць.
Я да яго
У думках зноў плыву…
Мінула мне
Ўжо сем.
Матуля гладзіць
Чубатую
З віхрамі галаву:
— Ты сам чакаў,
Ты марыў сам аб школе,
Дык гульні
Забывай, сынок, свае…
З вузельчыка,
З якім хадзіла ў поле,
Ржанога хлеба
Лусту дастае.

І гэты дар,
Духмяністую лусту,
У мой партфель
Да буквара кладзе.
Палае твар.
Я чырванею густа:
Калі ж у школе
Думаць аб ядзе?

— Не гавары!
Вучоба — тая ж праца.
Галодным
Не асіліш свой урок.
Бяры, бяры…
Вучыцца — дык старацца…
Спатрэбіцца акрайчык,
Галубок…

***

Вось і век
Пачынаецца новы…
Выціскаю
Надзеямі страх:
Беларусь мая —
Лісцік кляновы —
Не замерзне
На новых вятрах.

Час ідзе…
Разгарыцца калісьці
Над Айчынаю
Сонечны дзень.
Заіскрыцца
Зялёны мой лісцік
І ніколі на дол не ўпадзе.

***

Там, дзе Прыпяць прыпявае
Вечны свой прыпеў,
Беларус да свайго краю
Сэрцам прыкіпеў.

Бераг левы, бераг правы,
Як сярод людзей,
Не хапае пераправы
Часам дзе-нідзе.

Прыпяць, Прыпяць
не прыпыніць
Вольнае хады.
У яе магутнай плыні
Націск малады.

Хоць было сухое лета
І вясна не раз,
Перажыла Прыпяць гэта,
Не стрыножыў час.

Прыпяць, Прыпяць прыпявае
Вечны свой прыпеў,
Бо ў чароўным нашым краі
Люд не абмялеў.

Бераг левы, бераг правы
Мудрае ракі...
Мы будуем пераправы
На вякі.

Марыя КОБЕЦ

***

Я між зрэнак вачэй Вашых
спраўлю жытло,
Іх сінечы я стану часцінкай.
Хай запоўніць мне сэрца
блакіту святло!
Хай гарэзяць вясёлкамі
льдзінкі!

Я на Вашай шчацэ стану
цёплым дажджом,
На далоні растану
сняжынкаю.
Хай захліствае пролівень,
хай жа, суздром!
Я — упрыцем, насустрач,
сцяжынкаю!

Наўпрасткі, па вадзе…
Весні дзень, скрыгат крыг —
Шлях сінечы вачэй Вашых
родных…
Я на Вашым шляху —
мімалётнасці міг,
Вы ў маім — бессмяроцці
стагоддзяў...

***

Я кахаю Вас, гэта так…
Я кахаю Вас, гэта праўда…
Пранікаю ў Ваш сон няўзнак,
Прарастаю ў Ваш свет
няўладна.

Я кахаю Вас, гэта так…
Як ніхто не кахаў з
вяльможаў!
Ды прызнаннем сваім аніяк
Свет абвыклы Ваш не
ўстрывожу.

Прамаўляю імя, быццам Спас,
І тану ў агнявіцы гаючай.
Безадказна кахаю Вас —
Бездакорна-атрутна-балюча.

Б'е грымотамі сэрца…
Жах —
Падваконне глядзіць спакусна.
Я кахаю Вас
Проста так —
Да крыві на пасмяглых
вуснах…

Васіль ЖУШМА

Першы снег

Першы снег у першы дзень зімы
Лёг нясмела на траву, на голле.
Шапкі белыя насунулі дамы,
Коўдрай чыстаю захуталася поле.

А сняжынкі кружацца, ляцяць.
Танец іх віхурны і ўрачысты.
Я хачу ў далонь сняжынку ўзяць,
Паглядзець яе малюнак чысты.

Толькі прыгажосці той шкада:
Пекнасць іх жывою мне здаецца.
Мне здаецца — здарыцца бяда,
Як сняжынка кропляй разальецца.

Я стаю: вакол сняжынак рой.
Мройны, ён малюе мне выяву:
Мілы твар, што летняю парой
Я сустрэў зусім не на забаву.

Срэбны снег. Я дзякую табе!
Дзякую за згадку, за ўспаміны.
У салодкай я стаю журбе,
І на вуснах — спелы смак маліны.

Першы снег. У першы дзень зімы
Лёг нясмела і прапаў бясследна…
Ты са мною, я з табою: мы —
Гэта Богам дадзеная еднасць…

«Высока-Літоўск. Замкавая брама», 1876 г.
Від з боку ракі Пульвы. З правага боку — двухпавярховая замкавая брама. З левага ў глыбіні — касцёл Святой Тройцы з дзвюма вежамі. Малюнак створаны алоўкам, падпраўлены акварэллю.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ ПРЭМІЯ:

РАСКОША БЫЦЬ АКТУАЛЬНЫМ

Розныя літаратурныя жанры адлюстроўваюць розныя праявы жыцця. Гэта школьная ісціна. Але ў любыя часы на прозу — асаблівыя спадзяванні: нішто так маштабна і дэталёва не характарызуе эпоху і сучаснікаў, як раман ці аповесць. Сённяшні дзень, калі імклівa і незваротна мяняецца не толькі наваколле (у сэнсе экалагічным, грамадска-палітычным і сацыяльным), але і лад мыслення людзей, светаўспрыманне і формы камунікацыі, дае безліч тэм, сюжэтаў і магчымасцей філасофскага абагульнення. Сучасны пісьменнік не можа дазволіць сабе раскошы быць неабазнаным і абыякавым: выхад у свет чарговай неактуальнай кнігі нагадвае класічную показку пра хлопчыка і ваўка. Такім чынам, што мы маем сёлета ў намінацыі «Лепшы твор прозы»?

Уладзімір Гаўрыловіч пайшоў слядамі Івана Мележа і прапанаваў суайчыннікам раман-трылогію «Палешукі» (КПУП «Калор», Мазыр, 2017). Гісторыя палескай вёскі, паказаная праз падрабязнае апісанне лёсу некалькіх сем'яў ад 1930-х гадоў да сучаснасці, — па сутнасці, гісторыя роднай краіны ў самыя неспрыяльныя часы. Калектывізацыя, раскулачванне, рэпрэсіі, вайна, пасляваенная бязладзіца… І праз усё гэта — вера ў адвечныя каштоўнасці, упартая праца, сям'я, якія ратуюць душу ад скрушлівай безнадзейнасці. Пісьменніку ўдалося аднавіць мясцовы каларыт і на побытава-апісальным, і на моўна-стылёвым узроўнях. Чытач цалкам паглыбляецца ў атмасферу палескай вёсачкі з яе прымхлівым кансерватызмам. Выводзячы сваіх герояў у сучаснасць, У. Гаўрыловіч прапаноўвае нам кантрасты нораваў розных сацыяльна-грамадскіх перыядаў. І калі змест паняццяў «сумленне» і «гонар» не мяняецца, то, на вялікі жаль, мяняецца іх успрыманне ў сэрцах і галовах людзей.

Палескую тэму працягвае Аляксандр Валковіч. Кніга прозы «І тады запытайся ў сваёй самоты» («И тогда спроси свою печаль»; Брэст, «Альтернатива», 2017) уяўляе сабой, па сутнасці, калекцыю трапных аўтарскіх назіранняў. Крыху фальклору, крыху гісторыі, крыху сямейных легенд. Гумар, які заўсёды дае надзею, і самота, якая нязменна спадарожнічае любові, — тое, што вылучае аўтарскі стыль Аляксандра Валковіча. І там, дзе звычайны чалавек пачуе толькі ўрыўкі дыялогу, пісьменнік знойдзе сюжэт для новага твора.

Васіль Шырко ў зборніку аповесцей «Нязваны госць» («Мастацкая літаратура», 2017) закранае розныя тэмы і кантыненты (у аповесці «*Lepra*» героі выпраўляюцца ў Рэспубліку Гвінею), але чытач зноў атрымае гістарычна-мастацкі экскурс у беларускае мінулае часоў Вялікай Айчыннай вайны. І тут гаворка вядзецца не пра батальныя сцэны ці геройскія ўчынкі, не знойдзе чытач і падрабязных апісанняў партызанскіх аперацый. Падзеі мінулага ўплецены ў жыццё герояў, якія жывуць сёння, як успаміны, сямейная спадчына, падмурак сучаснасці не толькі ў шырокім нацыянальным сэнсе. В. Шырко, прасочваючы водгалас далёкіх дзён у лёсе герояў, нібы нагадвае: кожны твой учынак, кожнае прынятае табой рашэнне мае наступствы — працяг у будучыні, ужо нават і не тваёй, а тваіх нашчадкаў. Мабыць, нікому з нас

Фота Кастуся Дробава.

не хацелася б аказацца нязваным госцем у прышласці ўнукаў і праўнукаў.

Гістарычны раман Славаміра Антановіча «Дыверсант Сталіна» («Диверсант Сталина»; Мінск, «Смэлток», 2017) раскрывае не новыя, але недастаткова вывучаныя старонкі Вялікай Айчыннай вайны: сакрэтныя аперацыі дыверсантаў НКУС у тыле ворага, трагічныя лёсы легендарных разведчыкаў Аляксея Бацяна, Яўгена Беразняка і Мікалая Кузняцова. Падзеі таго часу і сёння атрымліваюць супярэчлівыя, неадназначныя ацэнкі спецыялістаў-навукоўцаў, пісьменнікаў, грамадскіх дзеячаў і звычайных людзей, неабыякавых да пытанняў асэнсавання роднай гісторыі. Мастацкае асэнсаванне не такога ўжо далёкага мінулага, створанае С. Антановічам, дае магчымасць абстрагавацца ад заангажаванасці і паспрабаваць зрабіць свае ўласныя высновы.

Раман прафесара доктара гістарычных навук Мікалая Ільінскага «Шлях у часе» («Путь во времени»; Мінск, «Беларусь», 2017) — плён мастацкага падагульнення прафесійных ведаў аўтара. Гістарычныя факты ў сюжэтнай аздобе прыгод, кахання, здрады, сяброўства, роспачы і змоўніцкіх памкненняў, як вядома, найлепшая аснова гістарычнай прозы. Шлях галоўнага героя Алексы з Грэцыі да роднага Ноўгарада Северскага ўвасоблены М. Ільінскім з такой колькасцю дэталяў і падрабязнасцей, што нават самы недасведчаны чытач атрымае якасную лекцыю па славянскай гісторыі пэўнага перыяду.

Крыху бліжэй да асвятлення беларускай гісторыі зборнік апавяданняў Валерыя Чудава «Наша славутая мінуўшчына» («Наше славное былое»; Мінск, «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», 2017). Асноўную ўвагу аўтар звяртае не на падзеі, а на асоб — некалі знакамітых і значных, але з цягам часу забытых на скразняках грамадска-палітычных перамен. Сапраўды, многія імёны будуць адкрыццямі нават для абазнанага чытача. Хто з нас, напрыклад, ведае, што Пётр I і Напалеон вучыліся майстэрству артылерыі па кнізе беларуса Казіміра Семяновіча? І ці многім вядома імя Барона Брамбеуса, якім падпісваў свае фантастычныя творы Восіп Сянкоўскі з-пад Вільні? Даўно вядома, што беларуская зямля надзвычай шчодрая на таленавітых людзей, якія працавалі на карысць самых розных краін. Валерый Чудаў пашырае геаграфічныя і тапанімічныя абсягі ў гэтай галіне гістарычнага краязнаўства.

З далёкай гісторыі ў сучаснасць вяртае нас раман Валерыя Казакова «Цень Гобліна» («Тень гоблина»; «Мастацкая літаратура», 2017). Пісьменнік — тонкі знаўца самых складаных момантаў пэўнага перыяду сучаснай расійскай палітыкі, які да таго ж змог увасобіць свой досвед у мастацкім пераасэнсаванні (калі ўсе імёны несапраўдныя і супадзенні выпадковыя, але прататыпы пазнавальныя). Непрывабная праўда ўнутранага жыцця таго свету, якая для шараговага чалавека трансфармуецца ў лаканічныя паведамленні ў стужцы навін, раскрываецца на старонках насычанага падзеямі і апісаннем інтрыг рамана.

Кніга прозы Ганада Чарказяна «Барвовы захад» («Багровый закат»; «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», 2017), у якую ўвайшлі тры раманы — «Не памірай раней за смерць», «Барвовы захад», «Горкі пах палыну», — найперш для ўдумлівага чытача, які шукае ў чытанні не адпачынку ад штодзённага клопату, а напружанай разумовай працы. Фактаалагічнае напаўненне сюжэтаў, грамадска-палітычны і сацыяльны кантэкст будуць зразумелы не ўсім пакаленням чытачоў, маладзейшым спатрэбіцца дадатковая гістарычная даведка. Народная мудрасць і яе трансфармацыя ў мысленні сучаснікаў аўтара — у цэнтры пісьменніцкай увагі.

Антон Параскевіч прапаноўвае даследаваць гісторыю і культуру Беларусі па знакамітых валунах («Валуны родной сторонки»; Мінск, «Колорград», 2017). Аляксандр Атрушкевіч даследуе лабірынты чалавечай псіхікі («Петля Мёбиуса»; Гомель, «Барк», 2017): прадказальнасць учынкаў, адвечнае спадзяванне на ўдачу і абсалютная бездапаможнасць перад ліслівай усмешкай спакусы. А чытанне аповесці ў навелах «Аднакласнікі» Аляксандра Джада («Одноклассники»; Гомель, ОАО «Полеспечать», 2017) з поспехам заменіць прагляд вечаровага тэлесерыяла. Калі ж мець на ўвазе, што творы, намініраваныя на Нацыянальную літаратурную прэмію, павінны адлюстроўваць усе бакі жыцця, то вясёлыя гісторыі Яўгена Калашнікава, сабраныя ў кніжцы «Шчупак таксама хоча жыць» («Щука тоже хочет жить»; Гомель, 2017), акурат прызначаны для своеасаблівай кантраснай разрадкі на фоне глабальных філасофска-гістарычных катэгорый, на якія абапіраюцца ўсе астатнія творы.

Немагчыма не звярнуць увагу на тое, што з 12 прапанаваных празаічных кніг толькі дзве — на беларускай мове. Думаецца, што для Нацыянальнай літаратурнай прэміі такі падыход не павінен быць характэрным. Паколькі асноўны інструмент мастацкай літаратуры — слова, то лагічна меркаваць, што прэмія такога высокага ўзроўню павінна быць прадстаўлена найперш родным словам.

Наталля НАРУТОВІЧ

Адзінота паэта

Фота Кастуся Дробава.

Сёлета намінацыя «Лепшы дэбют» магла б гучаць як «Лепшы паэтычны дэбют», бо наміманты Нацыянальнай літаратурнай прэміі — тры маладыя паэтэсы.

Да ўвагі журы прадстаўлены зборнік паэзіі Вікторыі Курбекі, якая, акрамя вершаў, піша казкі на беларускай і рускай мовах. Сваё першае самастойнае выданне «Наш мир — это звёзды» (Мінск, «Колорград», 2017) паэтэса прысвяціла тэмам кахання, шчасця і ў сувязі з гэтым — праблемам грамадства. Паэтычная думка сканцэнтравана на асэнсаванні тонкасцей жаночай душы. Таму галоўнай гераіні, увасабленню яе аўтарскага «Я», часам уласцівы паказная абыякавасць, перажыванне болю і здрады, пачуцці непаразумення, адзіноты і недаацэненасці і, разам з тым, вера ў магутнасць кахання, бязмежная адданасць. Паэтэса змагаецца за простае і адначасова незямное, ідэалізаванае шчасце: жадае раздзяліць усё на дваіх, перавярнуць свет дзеля сваёй палавіны, аддаць апошняе. І ўсё ў яе з душэўным надрывам. Увогуле, творы Вікторыі Курбекі характарызуюцца ідэйнай канкрэтнасцю: шматсэнсоўнасці і расплывістасці ў зборніку няма. Іншая справа, ці даспадобы будуць гэтыя ідэі і іх увасабленне чытачу.

Кніга вершаў і перакладаў Юліі Алейчанкі «Пад чароўным шкельцам» (Мінск, «Выдавецкі дом "Звязда"», 2017) суправаджаецца прадмовай Алеся Карлюкевіча, дзе адзначаецца, што паэтэса «знаходзіцца ў дарозе якраз да вялікай паэзіі». Ніхто не ведае, які кірунак прыме творчасць паэтэсы ў далейшым, але зараз ён характарызуецца разнастайнасцю і часам рознапалярнасцю пачуццяў, інтымнасцю і філасафічнасцю, насычанасцю сімваламі і іншасказаннямі. Першазначнасць у паэзіі Юліі Алейчанкі мае каханне, якое суправаджаецца сімваламі маладога, неабдымнага, чыстага, амаль казачнага шчасця:

Давай сустрэнемся ў Сонечным горадзе,
Дзе ўсе пацалункі на целе не змесцяцца,
Збяжым па гулкай параднай лесвіцы
У сад, дзе-птушкі-сірыны водзяцца.

Ёсць і трывожныя ноткі ў тэкстах Юліі Алейчанкі: вобразы чорнай ночы, атруты і зелля, грутана, што б'ецца ў шыбу, бадзяжных душ ідуць поплеч з лірычнай гераіняй, якая, бывае, знаходзіцца ў палоне самоты, смутку і страху, спрабуе ператварыць сваё сэрца ў камень, звяртаецца да каханага з недаверам, амаль заўсёды адчуваючы ненадзейнасць, небяспеку, скруху. У зборнік уключаны пераклады вершаў іншых паэтаў з розных краін: Эквадора, Непала, Удмуртыі, Туркменістана і Кітая. У кожны з іх аўтар укладвае часцінку сваёй душы.

Настасся Каротчыкава дэбютуе з выданнем «До мінор» (Мінск, «Колорград», 2017), якое прываблівае сваёй філасафічнасцю і сур'ёзнасцю. У слове ад аўтара паэтэса заўважае, што вершы і музыка заключаюць у сабе шмат судакрананння, бо ў кожнага з іх ёсць свая мелодыя. І нягледзячы на тое, што паэтэсе няма нават 22 гадоў, яна стварыла паэтычны зборнік аднароднага настрою, сугучны з трывожнай і крыху трагічнай мелодыяй «до мінор». Ён напоўнены адчуваннем хуткаплыннасці часу, і, здаецца, аўтар ужо адчувае сябе пасталелай не па гадах — шмат твораў прысвечаны пройдзенасці жыццёвай дарогі. Прыкмячаючы ўсю супярэчлівасць свету і пастаянна знаходзячыся ў пошуках, паэтэса прымярае на сябе некалькі роляў, некаторыя вершы нават напісаны ад мужчынскага імя. Падсумоўванне адбываецца вершам даволі самакрытычным:

И разве назовёшь стихами
Души моей чернильный след?
Моё из мыслей оригами?
Из строчек искренний букет?
Мой рок, измеренный листами?
Нет.
Я не поэт.
Нет…

Храналагічна і структурна гэта апошні твор зборніка. Ён дае чытачу нагоду для разважання, ці будзе Настасся Каротчыкава працягваць творчыя пошукі. У вершах адчуваецца ўплыў рускіх паэтаў на кампазіцыйным і ідэйным узроўнях. Супрацьпастаўленне сябе натоўпу, тэма чужога чалавека ўласціва творчасці Настассі Каротчыкавай у поўнай ступені. Усё ж такі існуе ўнутраны канфлікт гераіні, які наўрад ці дасць скончыцца плённай творчасці. Галоўны герой у аповедзе Настассі Каротчыкавай — час, які бяжыць, імкнецца, дадае вопыту, але адбірае шмат дарагога. Менавіта ён і пакажа, чым будуць цікавы асоба паэтэсы і яе творы.

Пры асэнсаванні вершаў любога паэта галоўнай мэтай з'яўляецца перадача тых вобразаў, пачуццяў, што ўзнікаюць пры чытанні і пасля яго. Бясспрэчна, гэта цалкам суб'ектыўная рэч, з якой можна і не пагадзіцца. Але нават суб'ектыўнасць чытачоў так ці інакш надае значнасці і ўвагі творам пачаткоўцаў.

Яўгенія ШЫЦЬКА

ЗНАЁМІМСЯ З НАМІНАНТАМІ

Не прыручай сваю тугу!..

Апошні год быў надзвычай плённым для айчынных творцаў: калі летась на атрыманне Нацыянальнай прэміі ў галіне паэзіі прэтэндавалі ўсяго 4 зборнікі вершаў, то сёлета ўжо 10. Прычым 7 з іх на беларускай мове і 3 — на рускай. Выданні адрозніваюцца па шырыні тэматыкі і ахопе праблем (напрыклад, калі творы Уладзіміра Рунцэвіча «Пасля сябе пакіну дабрыню»: Мінск, Кнігазбор, 2017 — амаль усе пра каханне, у Надзеі Парчук «Святло няскоранай душы»: Брэст, Альтэрнатыва, 2017 — выключна хрысціянскія матывы, то для Міколы Мятліцкага «Прысутнасць»: Мінск, Мастацкая літаратура, 2017 — няма тэмы, якая б засталася неасветленай, некранутай яго паэтычным пэндзлем). Аб'ём кніг таксама розны: некаторыя з іх уключаюць каля 100 ці крыху больш старонак (Святлана Быкава «Обретение свободы»: Мінск, Колорград, 2017), іншыя ж — каля паўтысячы (Міхась Башлакоў «Далеч вячэрняя»: Мінск, Народная асвета, 2017). Геаграфія прадстаўленых выданняў самая разнастайная: кнігі пабачылі свет і ў Мінску, і ў абласных цэнтрах. Адна з іх і ў раённым (Аляксандр Атрушкевіч «Перо кукушки»: Мазыр, КПУП Колар, 2017).

Зазначым, што 4 паэтычныя зборнікі ўжо былі аб'ектамі крытычных артыкулаў і водгукаў, змешчаных у штотыднёвіку на працягу 2017—2018 гадоў. У нататцы «500 старонак выбранага» («ЛіМ», № 12 за 24 сакавіка 2017) Наста Грышчук прааналізавала творы Міхася Башлакова, дзе характарызуе паэта як выдатнага пейзажыста, песняра прыроды. Небанальнымі яго вершы робіць недамоўленасць, стан героя, які не выказваецца наўпрост, а рэтранслюецца праз інтанацыю верша. Што тычыцца кнігі, то чытаць яе няпроста — аб'ём вялікі. У кнігу таксама ўвайшлі 4 паэмы і араторыя «Шлях». У анатацыі пазначана: «Ва ўсіх творах, у якіх аўтар узнімае вострыя і балючыя праблемы нашай рэчаіснасці: лёс Айчыны, народа, роднай мовы… жыве душа народа. Менавіта пранікнёным лірызмам, эмацыянальнасцю, шчырасцю, задушэўнасцю якраз і вылучаецца паэзія Міхася Башлакова». Застаецца толькі пажадаць чытачу набрацца цярпення і дачытаць важкі том да канца, каб атрымаць ад вершаў лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (2008) сапраўднае эстэтычнае задавальненне.

Арыгінальная вобразнасць характэрная для зборніка паэзіі Казіміра Камейшы «Высокі бераг» (Мінск, Каўчэг, 2017). Боль за вёску, філасофскі роздум, пераасэнсаванне пройдзенага шляху — асноўныя матывы творчасці паэта апошніх гадоў. Мікола Маляўка ў водгуку «На баку любові і памяці» («ЛіМ», №21 за 2 чэрвеня 2018) адзначае, што аўтар «не рэтушуе жыццё, а паказвае, як змянілася яно ў новым веку, асабліва ў глыбінцы… І не паказвае абстрактна, а на лёсе роднай вёскі Малыя Навікі… На лёсе землякоў. І на сваім лёсе таксама. Кніжка яшчэ і тым цікавая, што ў ёй яскрава прасочваецца лёс аднаго чалавека, паэта — у лёсе малой радзімы, у лёсе цэлай краіны…»

Галоўная праблема, якую вырашае ў творчасці Святлана Быкава, — унутранае разняволенне, дасягненне свабоды і смеласці быць сабой, ісці ўнутр сябе і рабіць адкрыцці ў спазнанні сябе, раскрывацца і рэалізоўваць сваю глыбінную сутнасць у складаным і поўным супярэчнасцей жыцці. З юнацкай дапытлівасцю паэтэса даследуе свой унутраны свет і робіць нечаканыя высновы, заўважае ў навакольным свеце новае і яркае ў даўно знаёмым, звыклым. Яе свядомасць нібы абнаўляецца і набывае пры гэтым большую адчувальнасць, вастрэйшы зрок і слых. У рэцэнзіі Таццяны Мацюхінай («Крыніцамі любові і хараства», «ЛіМ», № 20 за 25 мая) адзначаецца: «Пейзажным і філасофскім вершам С. Быкавай уласцівыя лаканізм, дэталёвасць і канкрэтнасць пры абмалёўцы мастацкіх вобразаў. Творчасць яе набывае прыкметы духоўнай лірыкі (традыцыйнасць, сакральнасць). Паэтэса звяртаецца да тэмы Майстра і яго дасканалага тварэння… Найвышэйшую форму дасканаласці з'яў прыроды бачыць у гарманічнай суладнасці простай і геніяльнай светабудовы, дзе няма зла, недахопаў і негатыву».

Калаж Кастуся Дробава.

Назва кнігі Міколы Шабовіча «Маладыя мроі маладога лета» (Мінск, Мінкапрынт, 2017) адразу настройвае чытача на жартоўны, несур'ёзны лад. Спрыяе гэтаму і звыклае амплуа паэта як дасціпнага парадыста і апявальніка жаночай прыгажосці. Тым не менш большасць вершаў у зборніку — глыбока філасофскія. Лірычны герой падсумоўвае свае набыткі, са смуткам і настальгіяй азіраючыся на пройдзены шлях, пераасэнсоўвае зробленае і перажытае, шкадуючы аб сваёй непаўторнай вясне. Але, раіць ён, «не прыручай сваю тугу, лепш усміхніся!» За гэта мы і любім творцу. Нішто нікуды не знікае, а ператвараецца ў нешта новае: страты і памылкі — у досвед і мудрасць, юнацкае палкае каханне — у сталыя адносіны, захапленне прыгажосцю — у разуменне каштоўнасці і бясцэннага дару жыцця, існавання ў кожным імгненні тут і цяпер… Водгук на зборнік быў надрукаваны ў сёлетнім «ЛіМе» (Аляксандр Жукоўскі «Дзіўнаспевы пачуццяў у новай кнізе Міколы Шабовіча», «ЛіМ», № 7 за 16 лютага).

Як прызнаецца ў прадмове да ўласнага зборніка Надзея Парчук, рашыцца на стварэнне паэмы пра жыццё святога Георгія Перамаганосца, якая дала назву і выданню, дапамагло боганатхнёнае чытанне старажытных кніг з бібліятэкі Жыровіцкага манастыра, а таксама вера людзей у яе талент. «Нам без Цябе дарогі не асіліць / Той, што вядзе да Вечнасці святой, / А Ты любога можаш з нас акрыліць / Свяшчэнным словам, вераю жывой…» — звяртаецца аўтар да Бога. Акрамя паэмы, зборнік уключае і вершы духоўнай тэматыкі. Ёсць прысвячэнні беларускім святым Ефрасінні Полацкай, Афанасію Брэсцкаму, Сафіі Слуцкай.

Зборнік Ніны Загурскай «У месяцовым перламутры» (Віцебск, Віцебская абласная друкарня, 2017) з'яўляецца прызнаннем у любові да роднага краю. Прысвячаючы вершы такім слынным асобам, як Францыск Скарына, Францішак Багушэвіч, Максім Багдановіч, Сяргей Грахоўскі, Уладзімір Караткевіч, Рыгор Барадулін, Васіль Быкаў, Сяргей Палуян, Яўгенія Янішчыц, паэтэса нібы адкрывае чытачу ўласныя духоўныя і мастацкія арыенціры. Яна па-філасофску пераасэнсоўвае жыццё, замілоўваецца прыгажосцю прыроды. Наколькі па-мастацку гэта зроблена? Вось дзве страфы з верша (аднаго з лепшых), які даў назву зборніку: «На срэбнай нітцы веташок / Гайдаецца ў начной прасторы, / З ім перамігваюцца зоры — / Натхнення нашага выток. / І на хвілінку нат здалося, / Што шэпча мне начная ціш: / "Расправіш крылы — паляціш"… / Ды не — з палётам не збылося».

Як удалы мастак-пейзажыст выступіў у зборніку Аляксандр Атрушкевіч, асноўны матыў лірыкі якога, акрамя прыродных замалёвак, — філасофскае асэнсаванне быцця. Прыгажосць навакольля часта падаецца ў плыні роздуму. Адзін з найбольш уражлівых вершаў — «Мир неделим», некалькі радкоў з яго хочацца прывесці: «…Багрово-красный солнца круг / Щекой припал к земле… / И ветер волны упросил / И те, насколько было сил, / Качали облака. / И рвал их ветер на пути, / Он резал их, как плуг, / Чтоб месяц мог тропу найти, / Когда захочет он идти / Пастись на звёздный луг».

Зязюля ў назве кнігі — вобраз часовасці, кароткасці чалавечага жыцця ў параўнанні з вечнасцю.

Уражвае зборнік Алы Чорнай «Фонарь» (Мінск, Выдавецтва «Чатыры чвэрці», 2017). Біблейскія і духоўныя матывы, пераасэнсаванне жыцця Ісуса Хрыста, філасофскія роздумы пераважаюць у творчасці аўтара. Паэзія — стыхія, дзе яна жыве. Пранікнёны тонкі лірызм, свежыя метафары, арыгінальнасць вобразаў зробяць чытанне святам. Упэўнена, гэта тая кніга, да якой захочацца вярнуцца не раз пасля прачытання. Зоркі, неба, бездань, крыштальная чысціня, дождж, туман — вобразы, якія насяляюць паэтычны свет А. Чорнай. А ліхтар — як сімвал святла добрых спраў, што мусіць пакінуць для іншых кожны з нас…

Найбольш маштабным па шырыні ўзнятых праблем выглядае зборнік Міколы Мятліцкага. У ім раскрываецца «сутнасць самога чалавечага жыцця, поўнага і значных гістарычных падзей, і трывожных, ахвярных выпрабаванняў падчас прамінулых ліхалецццяў, і стваральнай радасці мірнага нашага зямнога бытавання, калі фізічнымі і духоўнымі намаганнямі ўсяго народа будуецца маладая краіна ў цэнтры Еўропы», — пазначана ў анатацыі да кнігі. Акрамя вершаў, у кнігу ўвайшла паэма «Няходжанае поле» і вершаваная аповесць «Замкнёны дом» пра жыццё вёскі, пра чарнобыльскую трагедыю. М. Мятліцкі распавядае тое, праз што прайшоў сам разам з тысячамі суайчыннікаў: яго малая радзіма, вёска Бабчын, пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС апынулася ў зоне радыеактыўнага забруджання, а жыхароў перасялілі ў іншыя мясціны. Паэт паглыблены ў філасофскія роздумы, асэнсаванне імгненнасці чалавечага існавання. Адразу згадваецца біблейскае: спачатку было Слова… Слова і застанецца энергіяй духу...

Мы на зямлі — часова
Пад вечных нябёс званамі.
Што застанецца? — слова,
Прамоўленае намі…

Яна БУДОВІЧ

«Бяроза-Картузская. Кляштар картузіянцаў» 1861—1877 г.
Агульны выгляд ансамбля з мураванай агароджай, уязной брамай і вежамі.
Малюнак створаны алоўкам, падпраўлены акварэллю.

Кніга Дня

Ад народа — да Радзімы

Да Дня беларускага пісьменства, які сёлета ладзіцца ў Іванаве, «Выдавецкі дом “Звязда”» падрыхтаваў кнігу «Людзі Янаўскага краю» (аўтар тэксту і ўкладальнік Ігар Гетман). На старонках выдання з мноства лёсаў непадобных адно да аднаго людзей складаецца «партрэт» месца, дзе яны жывуць. З сукупнасці шматлікіх гісторый і дасягненняў жыхароў радзімы малой будуецца вялікая Радзіма, апетая патрыётамі. Беларусь пачынаецца ў мястэчках, і гэтым разам разглядаецца яе іванаўскі пачатак.

З прадмовай да чытача звяртаецца старшыня Іванаўскага раённага выканаўчага камітэта Юрый Бісун. Ён знаёміць з гісторыяй і сучаснасцю Янаўскага краю, разважае, чаму Іванава ўганаравана як сталіца XXV Дня беларускага пісьменства. Пасляслоўе ж тлумачыць тэматыку выдання: яна абумоўлена аб’яўленнем 2018 года Годам малой радзімы і правядзеннем XXV Дня беларускага пісьменства ў Іванаве.

Як вынікае з самой назвы, кніга «Людзі Янаўскага краю» знаёміць з вядомымі ўраджэнцамі і жыхарамі Іванава. Так, у выданні раскрываецца асоба міністра спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Сяргея Кавальчука, які паходзіць з вёскі Глінна Іванаўскага раёна. Падыход да гэтага аповеда выбралі душэўны: з Сяргеем Кавальчуком чытач знаёміцца праз інтэрв’ю з яго бацькамі — сямідзесяцідвухгадовай Нінай Сцяпанаўнай і сямідзесяцігадовым Міхаілам Іванавічам, якія займаюць «вялікі драўляны дом з вокнамі, упрыгожанымі, па старадаўняй традыцыі, аканіцамі». Пра сваё жыццё і працу гавораць адзін з самых аўтарытэтных беларускіх аграрыяў Аляксей Скакун, дырэктар філіяла «Каапрам» Іванаўскага раёна Мікалай Шыкалай, дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Снітава-Агра» Іванаўскага раёна Анатоль Глінік ды многія іншыя. Заўважна, што ў «Людзях Янаўскага краю» ўвага ўдзелена не толькі важным начальнікам: тут далі слова і простым людзям, якія заслужылі пашану суайчыннікаў сваёй працай. Гэта і ўладальнік знака «Выдатнік аховы здароўя» Антаніна Млынчык, і настаўніца пачатковых класаў сярэдняй школы № 4 Іванава Ала Скошчук, і паштальён аддзялення паштовай сувязі аграгарадка Опаль Марыя Мандрык…

Знайшлося месца і для ўшанавання выдатных постацей мінуўшчыны: праз інтэрв’ю з доктарам гістарычных навук, прафесарам, дырэктарам Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ Пятром Брыгадзіным згадалі Скірмунтаў — адзін з найзнакаміцейшых родаў Беларусі (дарэчы, 7 мая 2018 года адзначылі 150 гадоў з дня нараджэння палітычнага і грамадскага дзеяча Рамана Скірмунта, самага славутага прадстаўніка роду). Ёсць у Іванаве і свае цуды: так, протаіерэй Уладзімір Кавалевіч згадвае, як 21 лістапада 1999 года ў дзень святога Архістраціга Божага Міхаіла ў Свята-Пакроўскім храме заміраточыла ікона Божай Маці Пачаеўская.

Дзеля мастацкага аздаблення выкарыстаны фотаздымкі Валерыя Міхальчука і Васіля Жушмы (дарэчы, яму таксама далі слова на старонках кнігі). Выданне ўтрымлівае шмат ілюстрацый: пейзажы, партрэты герояў аповедаў, рэпартажныя здымкі з мерапрыемстваў раёна і інш.

Дар’я ЧАРНЯЎСКАЯ

У добрыя рукі:

Штогод выдавецтва «Мастацкая літаратура» напярэдадні Дня беларускага пісьменства спрабуе здзівіць чытачоў новымі і, галоўнае, цікавымі творамі, імкнецца захапіць канцэптуальным афармленнем кніг. І гэта вельмі важна: у стагоддзе сучасных тэхналогій кніжны рынак становіцца больш складаным і канкурэнтным, таму выдавецтвам трэба не проста працаваць у дынамічным тэмпе, але і шукаць спосабы якаснага піяру. Дзень беларускага пісьменства якраз дапамагае і пісьменнікам, і выдавецтвам прэзентаваць кнігі гучна і арыгінальна.

— Сёлетні год у нашай краіне праходзіць пад знакам Года малой радзімы. З гэтай нагоды выпусцілі кнігу «Зямля бацькоў, святая…» у серыі «100 вершаў», — расказвае пра кніжныя навінкі, якія будуць прэзентавацца ў Іванаве на Дні беларускага пісьменства, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар Шніп. — У зборніку прадстаўлены творы пачынаючы ад вершаў Якуба Коласа і заканчваючы паэтычнымі радкамі нашых сучаснікаў. На гэтую тэму можна было выпусціць не адзін том. Дарэчы, у гэтай жа серыі выйшла кніга «Каханне сад і ластаўка вясны» да 70-годдзя Яўгеніі Янішчыц, якая нарадзілася на Палессі. Паколькі дзень нараджэння паэтэсы ў лістападзе, то прэзентаваць кнігу ў межах Дня беларускага пісьменства будзе актуальна. На пачатку года ў нас выйшаў зборнік «Пялёсткі лотаса і хрызантэмы. 100 паэтаў Кітая XX стагоддзя». Вялікую працу, перакладаючы творы, зрабіў Мікола Мятліцкі. Дарэчы, гэтая кніжка цудоўна афармлена мастаком Камілем Камалам.



Выдавецтвам «Мастацкая літаратура» надаецца вялікая ўвага творчасці маладых пісьменнікаў. Сёлета пачата серыя «Час 21». У ёй пабачыла свет кніга Маргарыты Латышкевіч «Наш дом». Маргарыта, дарэчы, у мінулым годзе стала лаўрэатам Нацыянальнай прэміі Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Дэбют». У гэтай жа серыі выйшла кніга Станіславы Умец «Сэрца Сакры».

— Дарэчы, хацелася б нагадаць, што конкурс «Першацвет» працягваецца. Мы заклікаем маладых паэтаў і празаікаў, якім яшчэ няма 30-ці гадоў, дасылаць свае творы на адрас нашага выдавецтва, газеты «Літаратура і мастацтва», часопісаў «Маладосць», «Полымя», — працягвае Віктар Шніп. — У межах Дня беларускага пісьменства будзем актыўна расказваць пра гэты конкурс, адзначаць яго асаблівасці. За два гады існавання «Першацвета» яго лаўрэатамі сталі сорак маладых творцаў: дваццаць паэтаў і дваццаць празаікаў. Безумоўна, кожны год журы падтрымлівала ў першую чаргу новыя імёны. Але ж, на мой погляд, і тыя, хто быў сярод лаўрэатаў мінулых гадоў, могуць удзельнічаць у конкурсе сёлета. У Іванаве будзем прэзентаваць і адну з нашых прэстыжных серый «Жыццё знакамітых людзей Беларусі». Падзелімся тым, што ў нас выйшла кніга Алеся Разанава «Такая і гэтакі: талакуе з маланкай дождж», раскажам пра цікавую кнігу прозы Навума Гальпяровіча «На скрыжаванні слоў», пра кнігу Алега Ждана «Геній». Сёлета ў нашай краіне адзначаўся юбілей Максіма Гарэцкага. Да гэтага свята мы выдалі кнігу, у якой змешчаны ўспаміны пра пісьменніка, яго творы і фотаздымкі. Такое своеасаблівае трохбаковае знаёмства з аўтарам.

Яшчэ адна серыя, якую выдавецтва прэзентуе на Дні беларускага пісьменства, — «Наш сучаснік». У ёй ужо выйшла кніга Юліі Навіцкай «Голас сэрца», прысвечаная нашаму земляку касманаўту Алегу Навіцкаму. З дня на дзень «Мастацкая літаратура» чакае сігнал кнігі пра знакамітага скульптара Івана Міско, для якога тэма космаса стала справай жыцця. Таксама выдавецтва будзе прэзентаваць выданні, адрасаваныя юным чытачам. Сярод іх кнігі Алены Васілевіч «Вернісаж» і Тамары Бунты «Чароўны кошык».

Выдавецтва спадзяецца, што некаторыя з аўтараў, як і ў мінулым годзе, змогуць стаць лаўрэатамі Нацыянальнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Бо, як адзначае Віктар Шніп, у «Мастацкай літаратуры» выпускаюцца кнігі сапраўдных майстроў слова.

— Дзень беларускага пісьменства, безумоўна, матывацыя для кожнага выдавецтва ісці наперад, — падкрэслівае Віктар Шніп. — Усе сустрэчы ў рамках свята — гэта магчымасць твар у твар кантактаваць з нашымі чытачамі. Вельмі істотна, каб аўтары кніжак выступалі, расказвалі пра свае творы. Падчас такіх мерапрыемстваў для нас важна пачуць ацэнку працы. Бывае, што прапановы выказвае адзін чалавек, а атрымліваецца, што той адзін гаворыць за сотні людзей: такое дэталёвае і якаснае яго меркаванне.

Вікторыя АСКЕРА

Паколькі выдавецтва «Народная асвета» пераважна спецыялізуецца на выданні школьных падручнікаў, то іх праграма мерапрыемстваў на Дні беларускага пісьменства ў большасці будзе накіравана на дзіцячую аўдыторыю. Супрацоўнікі выдавецтва зрабілі плённую падрыхтоўчую працу, каб юныя госці прэзентацый і гульняў змаглі захапіцца дзеяннем.

— На Дні беларускага пісьменства акцэнт будзем рабіць на Год малой радзімы і кнігу «Спадчына», — расказвае намеснік дырэктара па маркетынгу і вытворчасці Юлія Дашкевіч. — Прэзентаваць выданне будзем з удзелам аўтара Міколы Маляўкі. Аддзел адукацыі Іванаўскага раёна параіў нам пяць дзіцячых калектываў, якія дапамогуць зрабіць прэзентацыю кнігі больш актыўнай і дынамічнай. Мы доўга думалі, як прыцягнуць людзей да нашай кнігі і пляцоўкі. Мне здаецца, многае вырашае інтэрактыў і магчымасць сумяшчэння розных жанраў культуры ў адным мерапрыемстве. Так, падчас прэзентацыі кнігі калектыў народнай творчасці Іванава будзе дэманстраваць самасшытыя ўборы мінулых стагоддзяў.

Падчас прэзентацыі кнігі Мікола Маляўка коратка раскажа пра асаблівасці побыту продкаў, пра аўтэнтыку і спадчыну, якой сёння карыстаецца беларускае грамадства. Аўтар будзе задаваць гасцям пытанні, звязаныя з рэчамі, якія практычна выйшлі з ужытку, але да гэтага часу знаёмыя людзям. Гэта будзе асацыятыўная гульня. У межах Дня беларускага пісьменства выдавецтва пакажа выстаўку дзіцячых малюнкаў. У ліпені «Народная асвета» абвясціла конкурс і да верасня дзеці дасылалі на скрыню ўстановы малюнкі, прысвечаныя Году малой радзімы. Конкурс аказаўся вельмі цікавым і запатрабаваным. Дзеці разважалі над рознымі аспектамі: хтосьці паказваў знакавыя месцы, а хтосьці і фантазіраваў на тэму, як можа выглядаць яго малая радзіма, напрыклад, у будучыні.

Фота Кастуся Дробава.

— Да свята мы падрыхтавалі шмат конкурсаў і віктарын. Яны, дарэчы, прысвечаны не толькі Году малой радзімы, але і спорту, — тлумачыць Юлія Дашкевіч. — Мне здаецца, будзе цікавая віктарына «Падарожжа ў краіну дарожных знакаў», прысвечаная Дню ведаў і Правілам дарожнага руху. Падчас віктарыны дзеці самі будуць распавядаць, як разумеюць правілы, дапамогуць дарослым перайсці дарогу. Таксама мы прыдумалі паравоз станцый. Трапіўшы на пэўную станцыю, дзіця зможа альбо адказаць на пытанне, альбо, наадварот, задаць яго. Напрыклад, на станцыі «Я пра спорт ведаю ўсё» дзіця зможа паказаць, што яму цікава, і, магчыма, адкрыецца з новага боку для свайго ж бацькі. Дарэчы, гэтыя конкурсы мы прымеркавалі да II Еўрапейскіх гульняў у 2019 годзе. У якасці прызоў для дзетак падрыхтавалі свае кнігі з серыі «Апавяданні дзеда-прыродаведа». Нам здаецца, што гэтая кніга зможа захапіць юных чытальнікаў.

2 верасня ў Іванаве выдавецтва «Народная асвета» плануе прэзентацыю серыі кніг «Святло вакол нас» Міхася Пазнякова з удзелам аўтара і вядомага беларускага кампазітара і спевака Сяргея Краўца. У Міхася Пазнякова ёсць цікавая кніга загадак на беларускай мове, якія дзеці падчас прэзентацыі паспрабуюць адгадаць. У межах святкавання Дня беларускага пісьменства выдавецтвам таксама запланавана прэзентацыя кніг Анатоля Зэкава.

Вікторыя АСКЕРА

кнігі вядучых айчынных выдавецтваў

Выдавецтва Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі

— На свяце мы прадставім кнігу Аляксандра Лакоткі, дырэктара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, «Мелодыі і летапіс эпох: па старонках гісторыі беларускай культуры». Была зроблена вялікая праца: прасочана гісторыя беларускай культуры ад яе зараджэння да нашых дзён, — зазначае загадчык галіновай рэдакцыі гістарычных і сацыяльна-эканамічных навук Юрый Бажэнаў. — Кніга распавядае і пра культуру сацыяльнай эліты, і культуру горада, і сяла; пра матэрыяльную, і пра духоўную культуру. Уяўляе цікавасць і расповед пра рэвіталізацыю, то бок ажыўленне народнай традыцыйнай культурнай спадчыны. Ёсць і пра сучасны перыяд: канец XX — пачатак XXI стагоддзя. Чытач даведаецца і пра лабірынты культуры атамнага стагоддзя, і пра камерцыялізацыю і меркантылізм культуры (гэта агульная з'ява для ўсяго сусвету), а таксама пра дасягненні і праблемы сучаснасці. Унікальнасць выдання ў тым, што ўвага надаецца не толькі рэалізаваным архітэктурным праектам, але распавядаецца і пра тыя, якія засталіся на паперы. Большасць даследчыкаў, калі пісалі пра культуру беларускага народа, мелі на ўвазе культуру сялянства. Хаця ў мінулым сялянства і было асноўным носьбітам культуры і складала 90% насельніцтва, усё ж адным сялянствам культура не вычэрпваецца. Тут аўтар падышоў больш комплексна: цэлая глава прысвечана культуры беларускай эліты, дзе распавядаецца пра палацы, сядзібы, вопратку арыстакратаў: шляхты, феадалаў. Гэта культура пакінула пасля сябе багатую спадчыну. Адразу згадваюцца палацы ў Міры і Нясвіжы, якія з'яўляюцца нацыянальным гонарам нашай краіны. Ёсць і пра славутыя слуцкія паясы. Шырока прадстаўлена і культура шматнацыянальнага горада. Выданне багата ілюстравана каляровымі здымкамі з усёй Беларусі. Ёсць у кнізе і філасофія: аўтар не толькі паказвае, але і асэнсоўвае сучасную культуру. Кніга атрымалася цікавай і папулярнай. Яна адрасавана і супрацоўнікам культуры, і школьнікам — усім, хто цікавіцца беларускай культурай.

Другая кніга, якая толькі выходзіць з друкарні, — «Ваяры Беларусі X—XI стагоддзя». Аўтар Мікалай Плавінскі — кваліфікаваны археолаг, пастаянны ўдзельнік раскопак. Прафесійна піша пра ўзбраенне, бо сам раскопваў і трымаў у руках. Перыяд ранняга сярэднявечча мала вядомы сучаснаму чытачу — больш мы ведаем войны пачынаючы з XIII ст., калі з'явіліся мангола-татары і крыжакі. А ў XI ст. сутычкі былі паміж самімі князямі, часам — і з вікінгамі, якія з'яўляліся тады самымі дасканалымі ваярамі і мелі найлепшае ўзбраенне. Яны наведвалі княствы, у першую чаргу Полацкае, прыплываючы на ладдзях з Балтыкі па Дзвіне. Першыя нашы князі былі варагамі: Рагвалод і Тур. На аснове археалагічных і летапісных даных аўтар рэканструяваў войска беларускіх ваяроў таго перыяду: з каго складалася, што ўяўляла сабой дружына і апалчэнне. У кнізе ёсць малюнкі, у тым ліку аўтара, паказана зброя блізкага і далёкага бою, засцерагальная. Распавядаецца, як выраблялася зброя.

Выдавецтва будзе прэзентаваць найлепшыя выданні за апошні год, энцыклапедыі: ужо выйшаў і 2-гі том Янкі Купалы, і кнігі пра Хатынь і Трасцянец, і выданне пра арганы Беларусі, і кніга Нікіціна пра вызваленне Беларусі да гадавіны аперацыі Баграціён.

Яна БУДОВІЧ

Издательство «Четыре четверти» / Publishing house «Four quarters»

Здаецца, можна было прызвычаіцца, што кожны год цудоўным вераснёвым днём мы накіроўваемся ў які-небудзь куток Беларусі, каб там прадэманстраваць свае здабыткі за год, правесці прэзентацыі новых выданняў, сустрэцца з калегамі і, самае галоўнае, з чытачамі выдадзеных кніг. Але ўсё ж хвалюемся, як заўсёды перад важнымі падзеямі, і… чакаем свята. Свята, сапраўды, заўсёды адбываецца і запамінаецца надоўга, — адзначае дырэктар выдавецтва Ліліяна Анцуг.

На Берасцейшчыне выдавецтва «Чатыры чвэрці», якому сёлета спаўняецца дваццаць пяць гадоў, запланавала прадставіць шырокай публіцы кнігі ўраджэнцаў гэтага краю — вядомых пісьменнікаў Зінаіды Дудзюк «На парозе раю» і Анатоля Крэйдзіча «Хуліган», якія ўбачылі свет у серыі «Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі».

Ёсць у нас і іскрынка — прыгожая, поўнакаляровая кніга-альбом «Беларускія скарбы ЮНЕСКА», дзе значнае месца займае аповед пра Нацыянальны парк «Белавежская пушча» — першы аб'ект з Беларусі, які быў уключаны ў 2005 годзе ў Спіс сусветнай спадчыны. Акрамя яго, у выданні прадстаўлены замкавы комплекс «Мір», геадэзічная дуга Струвэ і архітэктурны, культурны і жылы комплекс роду Радзівілаў у Нясвіжы. Упершыню аб'яднаныя пад адной вокладкай, яны пазнаёмяць з унікальнымі каштоўнасцямі, што належаць не толькі нашай краіне, а і ўсяму свету. Кніга выдадзена на рускай, беларускай, англійскай і французскай мовах.

Не абышлі мы ўвагай і тэму малой радзімы: на свяце раскажам пра дзве новыя кнігі з серыі «Малая радзіма. Барысаўскі раён» — «Лошница» і «Забашавічы». У гэтых выданнях упершыню сабраны матэрыялы, якія распавядаюць пра гістарычныя падзеі, што адбываліся ў гэтых месцах, успаміны відавочцаў, духоўнае жыццё і сённяшні дзень. Вялікую падборку выдавецкіх кніг убачаць наведвальнікі на стэндах ААТ «Белкніга».

Чарговая, чацвёртая па ліку, кніга-альбом сумеснага праекта Банка развіцця Рэспублікі Беларусь і выдавецтва «Чатыры чвэрці» «Культурная спадчына Беларусі» прадстаўляе беларускія скарбы ЮНЕСКА. «Упершыню аб'яднаўшы пад адной вокладкай выдання "Беларускія скарбы ЮНЕСКА", мы хочам пазнаёміць вас з унікальнымі каштоўнасцямі, якія належаць не толькі Беларусі, але і ўсяму свету», — падкрэсліў у прадмове Сяргей Румас, на той час старшыня праўлення Банка развіцця Рэспублікі Беларусь, цяпер Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь.

Кніга-альбом багата аздоблена фатаграфіямі і іншымі ілюстрацыйнымі матэрыяламі, якія даюць магчымасць пазнаёміцца з прыгажосцю Белавежскай пушчы, гістарычнай адметнасцю Мірскага замка, палаца Радзівілаў у Нясвіжы, а таксама зразумець прызначэнне геадэзічнай дугі Струвэ.

У выданні змешчаны разгорнутыя артыкулы на чатырох мовах: рускай, беларускай, англійскай і французскай. Гістарычная даведка, у якой кожны аб'ект падрабязна разглядаецца ў кантэксце агульнанацыянальнай і сусветнай культуры, дэталёвыя геаграфічныя, архітэктурныя і тэхнічныя апісанні даюць адказы на ўсе пытанні, якія могуць узнікнуць як у нашага суайчынніка, так і ў прадстаўнікоў іншых дзяржаў. Удалае спалучэнне ілюстрацыйнага (дарэчы, многія фатаграфіі сапраўды можна лічыць творамі мастацтва) і даведачнага матэрыялу робяць гэтае выданне адначасова і шыкоўным падарункам, і крыніцай вывучэння беларускага складніка сусветнай спадчыны.

Наталля НАРУТОВІЧ

«Беларусь»

У Іванаве выдавецтва «Беларусь» прэзентуе кнігу «Беларускі крымінальны вышук. Белорусский уголовный розыск» на беларускай і рускай мовах (аўтар тэксту і ўкладальнік — даследчык у галіне гістарычных навук і археалогіі Ю.У. Кур'яновіч). Выданне прысвечана 100-годдзю беларускага крымінальнага вышуку і падрыхтавана сумесна з Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

— Нягледзячы на тое, што сёлета наша выдавецтва прадстаўляе ў Іванаве толькі адну кнігу, яна вельмі важная і маштабная, з багатым гістарычным матэрыялам. Тэма крымінальнага вышуку актуальная для грамадства, бо ўсе любяць дэтэктыўныя сюжэты, а на старонках «Беларускага крымінальнага вышуку» разгортваюцца сапраўдныя дэтэктыўныя падзеі, сустракаюцца незвычайныя людзі і сітуацыі. Плануецца, што ў прэзентацыі выдання возьмуць удзел першы намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік крымінальнай міліцыі генерал-маёр міліцыі Іван Падгурскі, начальнік галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку крымінальнай міліцыі МУС палкоўнік міліцыі Анатоль Саковіч, аўтар кнігі Юрый Кур'яновіч, а таксама дырэктар выдавецтва «Беларусь» Сяргей Пешын і прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі. Мы не ўпершыню працуем з Міністэрствам унутраных спраў Беларусі: летась да стагоддзя беларускай міліцыі выдавецтва «Беларусь» падрыхтавала вялікую прыгожую кнігу «Милиция Беларуси: 100 лет. История и современность». Міністэрства ўхваліла якасць нашай працы і працягнула супрацоўніцтва: увосень адзначаюць 100-годдзе беларускага крымінальнага вышуку, і частка святкавання — прэзентацыя кнігі «Беларускі крымінальны вышук», якая выйшла з друку толькі напрыканцы ліпеня. Для выдавецтва «Беларусь» важна прадставіць новае выданне ў Іванаве: на свяце айчыннага пісьменства збіраецца наша мэтавая аўдыторыя — людзі, якія сапраўды любяць кнігу. Дзень беларускага пісьменства вандруе па краіне, штогод ладзіцца ў новых гарадах, і гэта вялікае свята для жыхароў раёна.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

«Буйновічы. Палац Эйсмантаў у фальварку Бурдыкаўшчына», 1876 г. Від з боку парку. Палац двухпавярховы, з балконам і аднапавярховымі крыламі. Малюнак створаны алоўкам, падпраўлены акварэллю.

Свята: госці ў хату

Падарожжы падчас Дня беларускага пісьменства найперш адкрываюць Беларусь самім беларусам. Але ўжо не першы год на наша свята прыязджаюць госці з-за межаў краіны. Некаторыя, каб пазнаёміцца, прыгледзецца, пабачыць, чым тут жывуць і пра што думаюць-мараць. А потым прыходзіць жаданне прыехаць яшчэ, каб наладзіць супрацоўніцтва і рабіць агульныя справы на карысць асветы, адукацыі і прыгожага пісьменства. Міжнародныя круглыя сталы ў межах Дня беларускага пісьменства сталі традыцыйнымі ў апошнія гады. Думкамі пра тое, у чым іх плён, сёння дзеляцца асобы, уключаныя ў дыялог літаратур, прытым, што кожны з іх (нават тых, хто жыве ў іншых краінах) прадстаўляе найперш беларускае пісьменства.

Аляксей Чарота, галоўны рэдактар часопіса «Нёман»:

— Рэгулярныя сустрэчы з замежнымі пісьменнікамі, круглыя сталы, а таксама Міжнародны сімпозіум літаратараў, які звычайна збіраецца падчас Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, ладзяцца не толькі дзеля таго, каб аўтары з розных краін маглі сустрэцца і паразмаўляць адно з адным, падзяліцца праблемамі, якія існуюць у літаратурным асяроддзі іх краін. Такія сустрэчы маюць плён у далейшым супрацоўніцтве, дапамагаюць ажыццяўляць новыя праекты. Многія з тых, хто прыязджаў на нашы мерапрыемствы, пасля выдавалі пераклады беларускіх пісьменнікаў у перыядычным друку сваіх краін. Часам выходзілі не толькі публікацыі ў газетах і часопісах, але і цэлыя кнігі. Так, наш чачэнскі госць Адам Ахматукаеў надрукаваў зборнік беларускай паэзіі на чачэнскай мове. Такія ж вынікі былі і ў выпадку з Юрыем Шчарбаковым: пасля ўдзелу ў беларускіх мерапрыемствах ён заняўся перакладам беларускіх паэтаў, як сучасных, так і класікаў.

Беларускія пісьменнікі не застаюцца ўбаку, а таксама звяртаюць увагу на творы замежных аўтараў, у першую чаргу тых, хто прыязджае на сустрэчы. Не забываюць і пра іх землякоў, цікавых не толькі для сваёй нацыянальнай літаратуры, але і для літаратуры сусветнай. Як вынік супрацоўніцтва з'яўляюцца адпаведныя часткі і рубрыкі ў айчыннай перыёдыцы, выдавецтвы друкуюць кнігі перакладаў замежных паэтаў і празаікаў. Адна з апошніх — кніга татарскага аўтара Роберта Мінуліна на беларускай мове.

Гасцей для новага круглага стала звычайна шукаюць праз ужо наладжаныя кантакты, апытваюць знаёмых пісьменнікаў. Часам знайсці літаратараў для ўдзелу ў мерапрыемстве дапамагаюць пасольствы адпаведных дзяржаў у Рэспубліцы Беларусь. Сёлета на круглы стол да нас прыедуць прадстаўнікі дзвюх краін, якія раней не наведвалі беларускіх літаратурных сустрэч. Гэта Кыргызстан (мы чакаем адтуль двух пісьменнікаў) і Эквадор. Новыя ўдзельнікі будуць сярод латвійскіх і польскіх гасцей, прадстаўнікоў Расійскай Федэрацыі.

Наведваюць круглы стол «Мастацкая літаратура як шлях адно да аднаго» і тыя, хто раней прыязджаў у Беларусь. Гэтыя аўтары пацвярджаюць, што знаёмства пісьменнікаў з розных краін і штогадовыя сустрэчы маюць плён. Яны вяртаюцца з пэўнымі напрацоўкамі, прадстаўляюць ажыццёўленныя за год праекты. Паказваюць, што паспелі зрабіць на сваёй радзіме на карысць абедзвюх літаратур. Напрыклад, літаратуразнаўца, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчыца аддзела аналітыкі і знешніх літаратурных сувязей Інстытута літаратуры і мастацтва імя М.А. Аўэзава Святлана Ананьева пастаянна працуе на папулярызацыю беларускай літаратуры ў Казахстане, прапаноўвае праекты для распаўсюджвання казахскай літаратуры ў Беларусі. Дзякуючы сумесным намаганням, з'яўляюцца кнігі, публікацыі ў прэсе, навуковыя працы.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

Фота Кастуся Дробава.

Пісьменнікам заўсёды ёсць пра што паразмаўляць падчас сустрэч.

Рыма Абызава, загадчыца музея Янкі Купалы ў сяле Печышчы Верхнеўслонскага раёна Татарстана:

— Менавіта на такіх сустрэчах вырашаюцца канкрэтныя пытанні і праблемы. Тым больш, жывая гутарка заўсёды ёсць і будзе прыярытэтнай. Толькі мы з'яўляемся філіялам Нацыянальнага музея Рэспублікі Татарстан, мы ўвайшлі ў праграму ўнутранага турызму рэспублікі. Плюс у тым, што наш музей знаходзіцца на супрацьлеглым беразе Волгі ад Казані, які заўсёды прывабны для турыстаў. Таму людзі спалучаюць прагулку на рачным транспарце з наведваннем музея (спалучаюць прыемнае з карысным).

На працягу многіх гадоў ідзе цеснае супрацоўніцтва з Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы ў Мінску. На жаль, у сучасную расійскую школьную праграму творы Купалы не ўваходзяць. Тым не менш, прыйшоўшы ў музей, наведвальнікі пачынаюць цікавіцца паэтам. Адкрываючы для сябе тым самым не толькі паэтычны талент Купалы, але і нацыянальную культуру Беларусі ў цэлым. А зусім нядаўна наш знакаміты татарскі паэт, ён жа дэпутат Дзяржсавета РТ, Рэнат Харыс пачаў перакладаць творы Янкі Купалы.

Міраслава Лукша, пісьменніца, журналіст беларускага выдання «Ніва» ў Польшчы:

— У святочныя для беларускага прыгожага пісьменства дні хочацца нагадаць пра творчасць беларускіх пісьменнікаў у Польшчы, што развівалася ў адметным асяроддзі, якое адрознівалася і ад савецкага, і ад цяперашняга беларускага, і эміграцкага. А адначасова яна не выпадала ні з польскага, ні з беларускага нацыянальна-культурнага кантэксту. Галіна Тычка назвала гістарычнай падзеяй агульнанацыянальнай значнасці заснаванне ў 1958 годзе ў Беластоку літаратурнага аб'яднання пры рэдакцыі штотыднёвіка беларусаў Польшчы «Ніва». У 1962 годзе аб'яднанне атрымала трапную назву «Белавежа», пад якой і ўвайшло ў гісторыю беларускай літаратуры. А гэтая рунь вырасла са старонак «Нівы», гуртуючы пры рэдакцыі аўтараў, што пішуць па-беларуску ў Польшчы.

Беларуская літаратура Польшчы — з'ява невыпадковая, а гістарычна-культурны вынік глыбокага нацыянальнага ўсведамлення сябе — беларусаў — беларусамі. Творчасць пісьменнікаў аб'яднання з'яўляецца выдатным прыгожым летапісам гэтай укаранёнай нацыянальнай свядомасці, якая безупынна аднаўляецца, безупынна асвяжаецца і з'яўляецца жывой. Гэтая думка рэзка кантрастуе з агульным адчуваннем недахопу чытачоў нашых кніг, недахопу сталага, частага кантакту з чытачамі нашых твораў. Але калі прыгледзімся бліжэй, то гэтая карціна нашага існавання не безнадзейная: многія творы «белавежцаў» трапілі ў школьныя праграмы, іх вывучаюць на спецкурсах у беларускіх вышэйшых навучальных установах, ва ўніверсітэтах. Як казаў Сакрат Яновіч, «белавежцы» ўзбагацілі агульнамастацкае ўяўленне — вобразам «Беласточчыны». Але іх кніжкі даўно перасягнулі межы Беласточчыны, Падляшскага ваяводства. Яны выходзяць у арыгіналах, у перакладах у Мінску і ў польскім перакладзе ў Варшаве. Паасобныя творы перакладзены на англійскую, італьянскую, нямецкую, рускую, сербалужыцкую, украінскую мовы. Некаторыя аўтары «Белавежы» пішуць адначасова на дзвюх мовах, а часам і на гаворцы сваёй мясцовасці, часта выступаюць за межамі Польшчы, у тым ліку і ў Беларусі — Брэсце, Гродне, Мінску.

Валерый Казакоў, пісьменнік, намеснік старшыні рады грамадскай арганізацыі «Федэральная нацыянальна-культурная аўтаномія "Беларусы Расіі"»:

— Я ведаю, што мае калегі не толькі ў Расіі, але і ва Украіне, і на Захадзе чакаюць гэтага дня, і чакаюць запрашэнняў ад Беларусі стаць удзельнікамі круглага стала, дзе абмяркоўваюцца пытанні літаратурнага супрацоўніцтва. Не толькі таму, што падчас беларускага свята адбываюцца сустрэчы з калегамі з іншых краін, што патрэбна само па сабе, але і таму, што адчуваецца культуратваральны пачатак, які сягае з глыбінь стагоддзяў у нашы дні і з'яўляецца ўрадлівай глебай для сучаснага развіцця ў нашым няпростым і стракатым свеце. Але беларуская культура мае свой твар і пры гэтым дэманструе жаданне быць адкрытай для іншых. Гэта сучасны і вельмі важны крок, што Беларусь узяла на сябе ролю каардынатара міжнароднага дыялогу і стараецца развіваць гэтую плынь у розных кірунках, у тым ліку літаратурным, пра што сведчаць плённыя сустрэчы пісьменнікаў у Беларусі. Таму натуральна, што гэтае свята — Дзень беларускага пісьменства — набывае міжнародны фармат. Асабліва пасля шырокага святкавання юбілею ўсходнеславянскага кнігадрукавання яно ўзнялося на больш высокую прыступку і прыцягвае прадстаўнікоў іншых народаў. Спачатку хочацца прыехаць з-за цікаўнасці, але потым з'яўляецца разуменне важнасці кантактаў, калі бачыш рэалізаваныя праекты ў галіне перакладу, публікацыі ў часопісах і сумесныя кніжныя выданні. Адчуваецца, як беларуская культура становіцца ўсё больш еўрапейскай, пры гэтым не адмаўляецца ад сваіх каранёў, але яна ідзе ў свет, разумеючы сваю вартасць. Не выпадкова нашы класікі займаліся перакладамі і друкаваліся ў замежных выданнях, і сучасным творцам гэта патрэбна. Не магу не ўзгадаць зноў беларускі выпуск «Раман-газеты», які зрабіў фурор у Расіі. Тая проза і паэзія з Беларусі, што была прадстаўлена расійскаму чытачу, стала для многіх адкрыццём.

І той чалавек, які трапіў у Беларусь на гэтае свята, пачынае суперажываць і спрыяць таму, каб гэтая культура развівалася.

Праграма XXV Дня беларускага пісьменства ў Іванаве

1 верасня

	Сярэдняя школа №4 Іванава *(вул. Савецкая, 78)* Урачыстая лінейка, прысвечаная Дню ведаў «Пісьменства і друк Беларусі — крыніцы культуры і духоўнасці народа»
	Універмаг *(вул. Савецкая, 79)* Урачыстае адкрыццё кніжнай крамы «Верасень»
	Цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф.І. Панфёрава *(вул. Першамайская, 5)* «З любоўю да роднага слова». Падвядзенне вынікаў раённага агляду-конкурсу сярод бібліятэк па папулярызацыі творчасці беларускіх пісьменнікаў
	Цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф.І. Панфёрава *(вул. Першамайская, 5)* Галерэя гістарычных асоб «Беларускія першадрукары»
	Цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф.І. Панфёрава *(вул. Першамайская, 5)* Выстава-хроніка «І будуць словы зноў гучаць над роднаю старонкай»
10.00—14.00	**Пляцоўка амфітэатра ў гарадскім парку** Конкурсная праграма XXII абласнога свята-конкурсу духавой музыкі «Фанфара-2018»
12.00 — 14.00	**Раённы музейны комплекс імя Напалеона Орды, в. Варацэвічы** *(вул. Крупскай, 36)* Міжнародны круглы стол беларускіх і замежных літаратараў «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго»
12.00 — 20.00 14.00 — 16.00	**Плошча Кастрычніка** **ФЕСТЫВАЛЬ КНІГІ І ПРЭСЫ** **Павільёны:** **«Кнігі і прэса Рэспублікі Беларусь»** (выданні мастацкай і вучэбнай кнігі, для дзяцей і юнацтва, энцыклапедычная літаратура, альбомы, эспазіцыя перыядычных выданняў: установы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты "Советская Белоруссия"», РВУ «Выдавецкі дом "Звязда"»); **«Слова пісьменніка»** (прэзентацыі, аўтограф-сесіі); **«Добрая кніга — дзецям»** (прэзентацыі дзяіцячых кніг, гульні, віктарыны); **«Друкарскі двор XVI стагоддзя»**
12.00 — 20.00	**Іванаўскі раённы Цэнтр культуры і народных традыцый** *(вул. Савецкая, 50а)* Выстаўка **«Беларускі буквар: сувязь пакаленняў»**, прысвечаная 400-годдзю першага ў свеце выдання пад назвай «Буквар» і Году малой радзімы. **«Беларусы. Арт-пазітыў»**. Выстаўка малюнкаў мастака-графіка А. Карповіча. Фотадакументальная выстаўка, прысвечаная юбілейным датам паэм Якуба Коласа «Новая зямля» і «Сымон-музыка». Літаратурна-дакументальная выстаўка **«Максім Гарэцкі. Ахвярую сваім "Я"…»**, прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння пісьменніка. **«Напісанае застаецца»**. Выстаўка кніг з фондаў Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага

«Камянец-Літоўскі. Вежа» 1876 г.
Агульны выхад цыліндрычнай вежы. Малюнак створаны алоўкам, падпраўлены акварэллю.

12.00 — 18.00	**Цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф.І. Панфёрава** *(вул. Першамайская, 5)* Навукова-практычная канферэнцыя «Іванаўскія чытанні»
14.00 — 16.00	**Мотальскі музей народнай творчасці** *(аг. Моталь, вул. Леніна, 29)* Краязнаўчыя чытанні па рукапісе Марыі Саковіч «Сяляне мястэчка Моталь і іх песні» (1877 год). Выстава «Таямнічая мова кнігі»
12.00 — 19.00 16.00 — 18.00	**Пляцоўка вакол Іванаўскага раённага Цэнтра культуры і народных традыцый** *(вул. Савецкая, 50а)* Праект «Майстры Брэстчыны». Выстаўка-продаж сувенірнай прадукцыі майстроў Брэсцкай вобласці, майстар-класы па традыцыйных рамёствах. Тэатралізаваны паказ «Запрашаем да Мэйты» (лабурская карчма). «Янаўскія замалёўкі». Музычна-паэтычныя чытанні на балконах горада
18.00 — 20.00	**Іванаўскі раённы Цэнтр культуры і народных традыцый** *(вул. Савецкая, 50а)* Фінал рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка», прысвечанага Году малой радзімы ў Беларусі
18.00 — 20.00	**Храм Пакрова Прасвятой Багародзіцы** *(плошча Кастрычніцкая, 1)* Малебен у Храме Пакрова Прасвятой Багародзіцы. Перадача Дабрадзейнага агню ад Труны Гасподняй на лампадкі і свечкі прыхаджан

2 верасня

08.15 — 08.45	**Сярэдняя школа № 4 Іванава** *(вул. Савецкая, 78)* Пасадка Саду Малітвы
09.00 — 10.30	**Храм Пакрова Прасвятой Багародзіцы** *(плошча Кастрычніцкая, 1)* Божая Літургія ў Храме Пакрова Прасвятой Багародзіцы. Перадача Дабрадзейнага агню ад Труны Гасподняй на лампадкі і свечкі прыхаджан
11.00 — 11.20	**Вул. 17 Верасня** Адкрыццё памятнага знака, прысвечанага XXV юбілейнаму Дню беларускага пісьменства ў Іванаве
11.20 — 11.55	**Вул. Савецкая, 17 Верасня, Першамайская, Леніна, Кірава** Урачыстае шэсце, прысвечанае 595-годдзю горада Іванава, XXV юбілейнаму Дню беларускага пісьменства
12.00 — 13.40	**Галоўная сцэнічная пляцоўка (гарадскі парк)** **УРАЧЫСТАЕ АДКРЫЦЦЁ XXV ДНЯ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА** Афіцыйная цырымонія адкрыцця свята. Мастацка-тэатралізаваная дзея «Малой радзіме пакланюся!». Уручэнне Нацыянальнай літаратурнай прэміі
12.00 — 20.00 14.00 — 16.00	**Плошча Кастрычніка** **ФЕСТЫВАЛЬ КНІГІ І ПРЭСЫ** **Павільёны:** **«Кнігі і прэса Рэспублікі Беларусь»** (выданні мастацкай і вучэбнай кнігі, для дзяцей і юнацтва, энцыклапедычная літаратура, альбомы, эспазіцыя перыядычных выданняў: установы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты "Советская Белоруссия"», РВУ «Выдавецкі дом "Звязда"»); **«Слова пісьменніка»** (прэзентацыі, аўтограф-сесіі); **«Добрая кніга — дзецям»** (прэзентацыі дзіцячых кніг, гульні, віктарыны); **«Друкарскі двор XVI стагоддзя».** **Праекты:** **Кнігі — пераможцы Нацыянальнага і Міжнароднага конкурсаў «Мастацтва кнігі»;** **Кнігі пісьменнікаў-юбіляраў.** Прэзентацыя выставачнага праекта **«Янка Купала. Жалейка»**, прымеркаванага да 110-годдзя выхаду першага паэтычнага зборніка Я. Купалы. Правядзенне грамадска-культурнай акцыі «Чытаем Купалу разам». Прэзентацыя творчых праектаў Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь **«ПРОчытанне», «Літаратура ў мастацтве».** **Выстаўка абласных і раённых СМІ.** **Святочны гандаль кнігай**
12.00 — 20.00	**Іванаўскі раённы Цэнтр культуры і народных традыцый** *(вул. Савецкая, 50а)* Выстаўка «Беларускі буквар: сувязь пакаленняў», прысвечаная 400-годдзю першага ў свеце выдання пад назвай «Буквар» і Году малой радзімы. «Беларусы. Арт-пазітыў». Выстаўка малюнкаў мастака-графіка А. Карповіча. Фотадакументальная выстаўка, прысвечаная юбілейным датам паэм Якуба Коласа «Новая зямля» і «Сымон-музыка». Літаратурна-дакументальная выстаўка «Максім Гарэцкі. Ахвярую сваім "Я"…», прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння пісьменніка. «Напісанае застаецца». Выстаўка кніг з фондаў Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага
14.00 — 15.30	**Галоўная сцэнічная пляцоўка (гарадскі парк)** «Бачу Беларусь такой…». Літаратурна-мастацкая дзея
	Ля будынка пошты *(вул. Піянерская, 5)* Гашэнне маркі і паштовага канверта, прысвечаных XXV Дню беларускага пісьменства ў Іванаве
15.30 — 15.45 15.45 — 17.00	**Галоўная сцэнічная пляцоўка (гарадскі парк)** Урачыстая цырымонія перадачы эстафеты свята гораду Слоніму Гродзенскай вобласці. «Мы разам!». Рэспубліканская народна-патрыятычная акцыя Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі
10.00 — 18.00	**Пляцоўка каля Іванаўскага раённага Цэнтра культуры і народных традыцый** *(вул. Савецкая, 50а)* Праект «Майстры Брэстчыны». Выстаўка-продаж сувенірнай прадукцыі майстроў Брэсцкай вобласці, майстар-класы па традыцыйных рамёствах
10.00 — 22.00	**Вул. Кірава, Карбышава** Праект «Брэсцкія панадворкі»
10.00 — 22.00	**Вул. Леніна, гарадскі парк** Кірмаш беларускіх прадпрыемстваў
10.00 — 22.00	**Гарадскі парк** Свята-фэст беларускай кухні і беларускай прадукцыі
16.00 — 18.00	**Іванаўскі раённы Цэнтр культуры і народных традыцый** *(вул. Савецкая, 50а)* Заключны канцэрт і ўзнагароджанне пераможцаў XXII абласнога свята-конкурсу духавой музыкі «Фанфара-2018»
17.00 — 19.00	**Спартыўныя пляцоўкі ў гарадскім парку** Таварыскія сустрэчы аматараў міні-футбола і валейбола. Паказальныя выступленні выхаванцаў маладзёжнага спартыўнага клуба «Асахі» (каратэ-до)
20.00 — 22.00	**Галоўная сцэнічная пляцоўка (гарадскі парк)** **ЗАКРЫЦЦЁ ДНЯ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА** Канцэрт майстроў мастацтваў «Льецца песня над Палессем»

Наступны прыпынак


Фота з сайта vellivas.ru.

СЛОНІМ

Маляўнічыя мясціны. Аглядаеш горад, і ў розныя яго часткі міжволі хочацца ўпісаць муры замкаў. Можа, таму, што яны тут калісьці былі?.. І засталіся не толькі згадкі пра драўляны замак часоў сярэднявечча, які стаяў на беразе Шчары, там дзе цяпер цэнтр горада ці замак на левым беразе, які называлі Верхнім, а потым узнік яшчэ і Новы — варта прыглядзецца да ландшафту, і ўяўленне напоўніць яго вобразамі мінуўшчыны. Але не толькі ў прасторы жыве дух мінуўшчыны, у летапісах таксама захоўваецца тая частка жыцця, калі горад здабыў сабе славу заслоны ад ворагаў. Гісторыя захавала звесткі пра яго жыхароў, што бралі ўдзел у Грунвальдскай бітве. Але тут усё ж больш любілі мірнае жыццё пад светлым небам, дзе лунаюць анёлы. Здаўна тут знаходзілася месца для ўсіх людзей, для прадстаўнікоў розных народаў, розных веравызнанняў: вернікі-хрысціяне ўсіх канфесій суіснавалі побач з мусульманамі і іўдзеямі. У Слоніме была справа для ўсіх: магдэбургскае права стварыла шырокія магчымасці для гандлю і зносін з іншымі гарадамі Еўропы.

Дбалі пра развіццё Слоніма гаспадары горада і кіраўнікі краіны. Напрыканцы XVI стагоддзя слонімскім старастам стаў Леў Сапега. Канцлер Вялікага Княства Літоўскага не часта бываў у горадзе, але дбаў пра яго, ператварыўшы ў адзін са значных палітычных цэнтраў дзяржавы. Традыцыі гарадскіх добраўпарадкаванняў, відаць, ідуць з тых часоў: пашырана плошча памяшканняў архіва і бібліятэкі, быў перабудаваны гарадскі замак ды з'явіўся новы палац Сапегі, дзе некаторы час нават адбываліся генеральныя сеймікі ВКЛ з удзелам паслоў і сенатараў ваяводстваў ды вырашаліся іншыя дзяржаўныя пытанні. Для прыёму важных гасцей у горадзе будаваліся адмысловыя дамы, масціліся вуліцы, узводзіліся масты, з'яўляліся маляўнічыя сады. Сапега заснаваў у Слоніме першы ткацкі цэх. Гаспадарнік, ён сачыў за павевамі часу і разумеў, што дабрабыт — гэта найперш вялікая праца. Напэўна, нездарма па магдэбургскім праве пры Жыгімонце III Вазе Слонім атрымаў герб «Ліс»?.. У глыбінях часоў схаваны тыя падзеі, але памяць пра іх жыве, таму справядліва, каб у горадзе з'явіўся помнік Льву Сапегу.

Вось як уславілі тут яшчэ аднаго свайго знакамітага земляка і слонімскага старасту — Міхала Казіміра Агінскага. Мемарыяльная дошка на будынку па вуліцы Опернай нагадвае пра чалавека, які падтрымліваў высокі культурны і мастацкі дух. Нездарма слава пра яго сядзібу ў XVIII стагоддзі ішла па Еўропе. Чалавек з адкрытым розумам і наватарскім мысленнем у сваёй рэзідэнцыі заснаваў друкарню, стварыў музычную капэлу і шыкоўны тэатр, напоўнены рознымі тэхнічнымі вынаходствамі таго часу — плавучы тэатр і для нашага часу не вельмі простая для арганізацыі з'ява. А сцэна дома оперы дазваляла рэалізаваць самыя смелыя рэжысёрскія задумы. У Слоніме ў той час віравала высокаінтэлектуальнае жыццё: ставіліся оперы і балеты, шмат якія замежныя артысты лічылі за гонар тут выступаць. А яшчэ гучала музыка выдатных кампазітараў таго часу, у тым ліку і самога гаспадара Міхала Казіміра Агінскага. Дзядзька натхніў на заняткі прыгожым мастацтвам і Міхала Клеафаса — тут ён пачынаў вучыцца музыцы, у цудоўных Палескіх Афінах, так называлі Слонім пры старасце Агінскім. Ён вядомы і літаратурнымі творамі, што выдаваліся ў слонімскай друкарні. Быў аўтарам кнігі «Байкі і не байкі». Ад часоў Агінскага захаваўся ў горадзе хіба што будынак аўстэрыі, што звяртае да вытанчанай эпохі барока. Але захавалася і яго запаветная мара — звязаць Чорнае мора з Балтыйскім праз канал. Канал Агінскага — яшчэ адно пацвярджэнне таго, што таленавіты чалавек — таленавіты ва ўсім: можна любіць прыгожае, жыць мастацтвам і пры гэтым маштабна мысліць у інтарэсах дзяржавы.

Слонім — горад, якому цягам гісторыі ўдавалася гарманічна існаваць у розных кірунках: эканамічным, прамысловым, інтэлектуальным, мастацкім. І духоўным. Касцёлы і цэрквы, што захаваліся з былых часоў (як касцёл Святога Андрэя) ці былі пабудаваны параўнальна нядаўна, сведчаць пра тое, што асвечаная зямля напоўнена жыццёвай сілай. Ці, можа, Маці Божая, што ступала на Слонімшчыне, у мястэчку Жыровічы, апякуецца ёю дагэтуль?..

Праз год сюды прывядзе «Дарога да святыняў», натхніўшы новы Дзень беларускага пісьменства.

Марыя АСІПЕНКА

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Ларыса Іванаўна ЦІМОШЫК

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк
30.08.2018 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 1338

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 2972

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.